КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 13 (189)
◂ 9 КРАСАВІКА ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**АЛЕСЬ ЛАГВІНЕЦ**

Стар. 5

**ДАКУМЕНТ З ІНТЭРНЭТУ**

Кожны беларус мае права скардзіцца, чым ён рэгулярна і займаецца, і ў гэтым яму ўлада не перашкаджае

Стар. 4

**ВЯРТАННЕ КУЧМЫ**

Пра тое, што адбываецца зараз ва ўкраінскай палітыцы, журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з кіеўскім палітолагам Юрыем Дакукіным

Стар. 12

**АМЕРЫКАНСКІ МАСТАК З ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА КРАЮ**

Стар. 14–15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**БАРЫС КІТ: Я ЗАЎЖДЫ НАЗЫВАЎ СЯБЕ БЕЛАРУСАМ**

Працяг размовы з журналістам "НЧ" Генадзем Кеснерам

▸ ПАЛІТЭКАНОМІКА

# ЗА НАФТУ РАСПЛАЦІЦЦА НАСЕЛЬНІЦТВА

Вольга Хвоін

**Страты бюджэту Беларусі з-за росту коштаў на імпартуемую з Расіі нафту ўрад ацэньвае ў 5,9 трыльёна беларускіх рублёў (каля 2 мільярдаў долараў). У якасці кампенсуючых мераў прапануецца падвысіць акцызы на некаторыя тавары, а таксама вызначыць мяжу росту фонду заработнай платы.**



Гэта інфармацыя была абнародавана ў форме ліста беларускага ўрада кіраўніцтву Міжнароднага валютнага фонду. Эканаміст Сяргей Чалы мяркуе, што МВФ спрабуе давесці да лагічнага фіналу працу, якая была распачата ў Беларусі з выдачай крэдыту па праграме stand-by, а ўрад краіны — знівеляваць факт таго, што не быў выкананы шэраг абавязальніцтваў перад МВФ, як то стварэнне агенцтва па прыватызацыі, фінансавага агенцтва развіцця, адсутнасць сістэмных зрухаў у галіне лібералізацыі эканомікі.

«Міжнародны валютны фонд насамрэч зацікаўлены ў працягненні супрацоўніцтва, бо яго эксперты ведаюць сітуацыю, было выдаткавана нямала інтэлектуальных рэсурсаў. Ёсць адмысловы дакумент фонду, у якім распісаныя ўсе меры, якія неабходна рэалізаваць, каб змяніць вектар беларускай эканомікі», — гаворыць эксперт Сяргей Чалы. Ён мяркуе, што ў супрацоўніцтве не надта зацікаўлены якраз беларускі бок, хаця і грошы МВФ — адны з самых танных. Прычына ў тым, што крэдыты выдаюцца пад праграмы рэформаў, і простыя пераўтварэнні ўжо зробленыя, а да больш глыбокіх «быццам бы пакуль не гатовыя».

Ва ўрадзе прапануюць кампенсаваць страты бюджэту за кошт карэкціроўкі эканамічнай палітыкі. Напрыклад, з дапамогай рацыяналізацыі нафтавага сектара, скарацiўшы вытворчасць і падвысіўшы эфектыўнасць. Плануецца адмяніць звязаныя з экспартам датацыі, якія выдзяляюцца нафтаваму сектару, і мыта на экспарт сырой нафты і нафтапрадуктаў, а таксама падвысіць аптовыя кошты на 7 працэнтаў, што прывядзе да скарачэння стратаў бюджэту.

Цяжар расійскай нафты ляжа на бюджэт аматараў выпіць і пакурыць — плануецца падвышэнне ставак акцызаў на тытунёвыя вырабы і алкагольную прадукцыю на 10 працэнтаў. Гэта дазволіць пакласці ў бюджэт каля 0,12 трыльёна рублёў. Таксама, як перадае БелаПАН, чакаецца падвышэнне ставак адлічэнняў у інавацыйныя фонды — яшчэ плюс 0,35 трыльёна рублёў.

Гэтыя грошы будуць накіраваныя на рэалізацыю мерапрыемстваў па энергазахаванні, якія былі раней закладзеныя ў бюджэт. Падвышэнне падаткаў на сыравінную галіну дазволіць атрымаць дадаткова 0,6 трыльёна рублёў. Ужо падняліся ў сярэднім на 10 працэнтаў закупачныя кошты на буйную рагатую жывёлу, а на свінняў — на 5 працэнтаў. У сакавіку ў сярэднім на 10 працэнтаў былі падвышаныя кошты закупкі малака. У Мінэканоміцы тлумачаць гэта ростам выдаткаў на яго вытворчасць, а таксама неабходнасцю ўраўняць айчынных вытворцаў з вытворцамі суседніх краін, дзе закупныя кошты на малако больш высокія.

Апроч падвышэння цэн, нас чакае і «стоп» у росце заработнай платы. Урад мае намер абмежаваць павелічэнне фонду аплаты працы ў 2010 годзе ў межах 11 працэнтаў. «На пачатку бягучага года мы падвысілі тарыфную стаўку першага разраду на 5 працэнтаў, а пенсіі — на 10 працэнтаў. Любое далейшае падвышэнне зарплаты ў бюджэтным сектары пасля першага квартала будзе разглядацца толькі, калі дазволяць макраэканамічныя ўмовы. Мы будзем па-ранейшаму прытрымлівацца практыкі абмежавання росту зарплаты работнікаў дзяржаўных прадпрыемстваў, якія атрымліваюць дзяржпадтрымку. Прымаючы рашэнне пра падвышэнне пенсій, будзем кіравацца неабходнасцю забяспечваць устойлівасць Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва», — цытуе БелаПАН ліст да МВФ.

Да канца чэрвеня на сем долараў мусяць вырасці тарыфы, і надалей урад будзе стрымліваць субсідыі жыллёва-камунальных паслуг, што прадастаўляюцца насельніцтву. Усе пералічаныя меры мусяць дапамагчы скараціць разрыў бюджэтнага фінансавання на 1 трыльён рублёў. «Каб закрыць рэшту разрыву фінансавання, мы пачнём здзяйсняць дадатковыя меры па ўмацаванні прыбытковай часткі бюджэту і/ці скарачэнню выдаткаў у другім паўгоддзі. Калі гэтыя меры будуць недастатковыя для закрыцця разрыву фінансавання, дэфіцыт бюджэту можа быць падвышаны на велічыню да 1 трыльёна рублёў», — гаворыцца ў лісце.

«Напаўненне бюджэту за кошт фіскальнай палітыкі, скарачэнне выдаткаў — гэта відавочныя захады ў дадзенай сітуацыі, — зазначае Сяргей Чалы.— Але ў выніку ўсё будзе залежаць ад сістэмных зменаў, якіх і чакае МВФ. Напрыклад, калі ўсё ж будзе створана фінансавае агенцтва развіцця, у нас, магчыма, нарэшце з'явіцца шанец разблытаць складаную сістэму беларускай эканомікі. Бо ўся яна пабудаваная на прыватных мерах, выключэннях, палёгках асобным прадпрыемствам і г. д. Ключавая ідэя ў тым, каб сістэматызаваць усё гэта, і далей ужо накіроўваць рэсурсы ў эфектыўныя сферы, а не рассейваць у паветры».

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ВІЦЕБСК. ВОБЫСКІ БЫЛІ ДАРЭМНЫЯ

Працягваецца ціск на газету «Віцебскі кур'ер». Напрыканцы мінулага тыдня міліцыянты паспрабавалі канфіскаваць чарговы наклад выдання. Напачатку супрацоўнікамі Першамайскага РАУС быў учынены вобыск машыны дырэктара прадпрыемства выдавецтва. Выяўлена толькі 52 паасобнікі. На наступны дзень да пошуку чарговага накладу далучыліся міліцыянеры з абласнога УУС. Затрымлівалі і абшуквалі ўсе сінія і блакітныя мікрааўтобусы, якія ехалі з Расіі. Такога колеру рэдакцыйная машына, і яна была затрымана. Вобыск не даў ніякіх вынікаў. У гэты раз газета была дастаўлена чытачам іншым шляхам.

### МЯДЗЕЛ. ЧАРГОВЫ ПАХОД ВЯСКОВЫХ МУЗЫКАЎ

Гурт з назвай «Da! Бл…» з вёскі Нарач арыгінальнасцю сваіх твораў ужо некалькі гадоў радуе слухачоў і мае вядомасць не толькі ў краі. Зараз гурт запісаў новы хіт «Сенсацыі», у якім, як распавядае яго лідэр Віктар Мароз, сведчанне рэчаіснасці: «Гэта песня не пра асабістае жыццё чалавека, а пра кожнага з нас, хто з'яўляецца часцінкай грамадства». Твор стаў запатрабаваны ад пачатку яго прэзентацыі не толькі ў мясцовых прыхільнікаў калектыву. У 2008 годзе вясковы гурт стаў пераможцам тутэйшага фэсту «Ноч ваўкалака».

### ДОКШЫЦЫ. ПАДАРУНАК І ЗНЯВАГА

Напрыканцы мінулага года супрацоўніца дзяржаўнай крамы «Журавінка» Алеся Навуменка выйшла замуж. На вяселлі, сярод іншых падарункаў, маладыя атрымалі ад турфірмы дакумент на 10-дзённую паездку ў Егіпет. Калі ў лютым падышоў тэрмін паездкі, заўкрамы Ала Барыла не дазволіла цяжарнай жанчыне пайсці ў кароткатэрміновы адпачынак. Навуменка гэта пытанне вырашыла праз кіраўніцтва гаргандлю. Па вяртанні Барыла ў прысутнасці калектыву ўчыніла супрацоўніцы «вывалачку». Пасля чаго Алеся Навуменка з нервовым стрэсам патрапіла ў лякарню. Затым быў зварот у суд, які прызнаў Алу Барылу вінаватай у перавышэнні службовых паўнамоцтваў і пакараў штрафам у 280 тысяч рублёў на карысць дзяржавы. Зняважаныя гонар і годнасць цяжарнай жанчыны суд пакінуў па-за ўвагай.

### МАСТЫ. АГІТУЙЦЕ Ў ПОЛІ І ЛЕСЕ

ЦВК прапанавала Мастоўскаму райвыканкаму ўнесці змены ў рашэнне аб вызначэнні месцаў для правядзення масавых мерапрыемстваў, пасля таго, як чатыры кандыдаты ў Мастоўскі райсавет ад хрысціянскіх дэмакратаў скіравалі скаргу ў Цэнтравыбаркам аб парушэнні выбарчага заканадаўства. «Мастоўскі райвыканкам вызначыў толькі 2 месцы ў г. Масты на значнай адлегласці ад выбарчых акругаў нашых кандыдатаў. Мы запатрабавалі стварыць нам роўныя ўмовы для правядзення агітацыі шляхам правядзення масавых мерапрыемстваў. ЦВК стала на наш бок і прапанавала Мастоўскаму райвыканкаму вызначыць месцы для агітацыі на выбарчых акругах нашых кандыдатаў», — каментуе сітуацыю цяперашні дэпутат райсавета Дзмітрый Кухлей.

### БРАСЛАЎ. ПРЫЗНАЧАНА ДАТА ФОТАПЛЕНЭРУ

Ужо ў другі раз Браслаў запрашае актыўных і крэатыўных аматараў фотамастацтва на пленэр «Ён — Прастора, Ён — Творца». У мінулым годзе фотапленэр быў спалучаны з пленэрам для мастакоў, напрыканцы якога адбылася прэзентацыя прац удзельнікаў пленэру — жывапіс, малюнак, графіка, калаж і фотаздымак — у браслаўскім санктуарыі Маці Божай Валадаркі Азёраў. Сёлета сустрэча для прафесійных фатографаў і тых, каго цікавіць мастацтва фатаграфіі, адбудзецца з 10 па 18 ліпеня. Колькасць удзельнікаў абмежаваная, таму пра сваё жаданне ўдзельнічаць арганізатары просяць паведаміць не пазней, чым за два тыдні да пачатку пленэру.

ВЕЧАРЫНА

## ДА 100-ГОДДЗЯ БАРЫСА КІТА

Генадзь Кеснер

**Сотні прадстаўнікоў беларускай дэмакратычнай грамадскасці адзначылі 6 красавіка 100-годдзе слыннага сына зямлі беларускай Барыса Уладзіміравіча Кіта. З гэтай нагоды ў сталічным Палацы мастацтваў адбылася ўрачыстая вечарына.**

У залі, дзе ладзілася гэтая святочная імпрэза, як кажуць, яблыку не было дзе ўпасці — туды прыйшлі і простыя людзі, і вядомыя грамадскія і палітычныя дзеячы, навукоўцы, літаратары, мастакі, журналісты — усе тыя, хто паважае гэтага неардынарнага, таленавітага, непаўторнага і мужнага чалавека, якому лёсам сталася наканавана размяняць адзінаццаты дзесятак.

Пра жыццё і дзейнасць Барыса Кіта распавядалі шматлікія архіўныя і сучасныя фотаздымкі, афармленыя ў адмысловую выставу, слайды, якія штохвілінна мяняліся на вялікім экране за подыумам. Старшыня Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» Алена Макоўская і кіраўнік аргкамітэту па святкаванні стагоддзя Барыса Кіта пісьменнік Васіль Якавенка распавялі пра складаны і выбітны жыццёвы шлях, пра яскравую навуковую і грамадскую дзейнасць юбіляра. Алена Макоўская згадала тых людзей, дзякуючы якім імя Кіта «вярнулася ў Беларусь», — гэта Васіль Быкаў, Лідзія Савік, Васіль Якавенка, Петр Краўчанка, Вацлаў Мацкевіч, Дыяна Чаркасава, Валер Каліноўскі, Вольга Іпатава, Адам Мальдзіс, Радзім Гарэцкі, Сяргей Законнікаў ды іншыя.

Лідзія Савік, якую называюць даверанай асобай Барыса Кіта ў Беларусі і першым яго біёграфам, зачытала вітальны ліст Барыса Уладзіміравіча да ўдзельнікаў урачыстай вечарыны. «Вельмі шкадую, што з прычыны свайго не вельмі моцнага здароўя не змог прыехаць да вас у Мінск, каб разам з вамі адзначыць мой дзень народзінаў. Узгадваючы сваё жыццё, я шырэй бачу панараму пакутнага, а ў нечым і шчаслівага стагоддзя, якое мне давялося перасягнуць. Можа, Бог пакінуў мяне на гэтай грэшнай зямлі надоўга якраз для таго, каб я, апроч усяго іншага, змог пакінуць сведчанні пра дарагіх майму сэрцу незабыўных светлых людзей і падзеі», — напісаў віноўнік урачыстасці.

Сярод тых, хто казаў цёплыя словы пра юбіляра, былі пісьменнік Уладзімір Арлоў, паэт Сяргей Законнікаў, бард Алесь Камоцкі, акадэмік Радзім Гарэцкі, сваімі ўражаннямі ад нядаўніх сустрэч з Барысам Кітом у нямецкім Франкфурце-на-Майне, дзе зараз жыве гэты вялікі чалавек, падзяліліся першы кіраўнік незалежнай Беларусі Станіслаў Шушкевіч і галоўны рэдактар «Народнай волі» Іосіф Сярэдзіч.

А прадстаўнік Міністэрства культуры Віктар Маліноўскі зачытаў вітальны ліст да юбіляра кіраўніка гэтага дзяржаўнага ведамства Паўла Латушкі (сам міністр не змог прысутнічаць на вечарыне, бо знаходзіўся ў Маскве).

Пры канцы імпрэзы перад прысутнымі выступілі барды Алесь Камоцкі і Тацццяна Беланогая, а таксама оперны спявак, кіраўнік «Беларускай капэлы» Віктар Скарабагатаў.

СПРАВА

## МАСАВАЕ АБСЛЕДАВАННЕ

**З 29 сакавіка па 2 красавіка ў рамках сумеснага праекту Еўрапейскага саюза і Праграмы развіцця ААН «Мінімізацыя наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» было праведзена масавае медыцынскае абследаванне (скрынінг) працаздольнага насельніцтва і дзяцей горада Мазыра (Гомельская вобласць).**

Скрынінг праводзіўся на базе Мазырскай цэнтральнай паліклінікі пры садзейнічанні Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь і Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі (БЕЛМАПА) у рамках праектнага кампанента «Стварэнне міжнароднага навукова-практычнага цэнтра захворванняў шчытападобнай залозы».

Па словах кіраўніка праекту Андрэя Пінігіна, гэта першы медыцынскі скрынінг, праведзены ў рамках праекту ЕС/ПРААН. Новыя дадзеныя, атрыманыя падчас масавага медыцынскага абследавання, стануць фундаментальнай навуковай платформай для міжнароднага цэнтра, адкрыццё якога запланавана на канец 2010 года.

На працягу тыдня лекары і лабаранты міжнароднага фонду «Арніка» зрабілі агляд больш 600 чалавек, 150 з якіх — дзеці. Як паказалі папярэднія вынікі абследавання, насельніцтву, якое пражывае на забруджаных тэрыторыях, патрэбна пастаяннае назіранне і агляды спецыялістаў.

Абследаванне ўключала правядзенне УГД шчытападобнай залозы, антрапаметрыю, а таксама азначэнне ўзроўняў гармонаў шчытападобнай залозы. Як паказвае практыка і шматгадовыя даследаванні ў Беларусі, наступствы Чарнобыльскай катастрофы ўсё яшчэ накладваюць негатыўны адбітак на здароўе насельніцтва. Менавіта з гэтым звязаны той факт, што асобным мэтавым сегментам даследавання сталі дзеці, народжаныя пасля Чарнобыльскай катастрофы. На жаль, падчас абследаванняў у дзяцей былі выяўленыя некаторыя адхіленні і паталогіі, звязаныя як са шчытападобнай залозай, так і з агульным фізічным развіццём.

Вынікі абследавання цяпер знаходзяцца ў стадыі апрацоўкі, аднак падчас абследаванняў былі выяўленыя эндакрынныя парушэнні ў шэрагу маладых людзей, якія раней не звярталіся за эндакрыналагічнай дапамогай. Папярэднія вынікі скрынінгу даказваюць неабходнасць правядзення адукацыйных семінараў для пацыентаў — з акцэнтам на важнасць іх асабістага ўдзелу падчас дынамічнага назірання за сваім здароўем.

СУД

## ЦІСНУЛІ, КАБ ПРЫЗНАЎ ВІНУ

**Працягваецца разгляд крымінальнай справы, заведзенай супраць ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча і Уладзіміра Асіпенкі, а таксама Міхаіла Казлова і Аляксандра Ларына па абвінавачванню ў падрыхтоўцы тэракту.**

На гэтым тыдні ў судзе даў паказанні адзін з асноўных сведак і былы дырэктар ваўкавыскай фірмы «Ніка-транс» Юрый Лявонаў, якога першапачаткова таксама абвінавачвалі па гэтай жа справе. Лявонаў расказаў, што адразу пасля арышту яму расказалі версію, нібыта Аўтуховіч рыхтаваў замахі на чыноўнікаў, і дабіваліся прызнання ў саўдзеле падрыхтоўкі злачынстваў, інакш яго б чакаў вялікі турэмны тэрмін.

Падчас разгляду справы Мікалай Аўтуховіч заявіў суду, што «гатовы даказаць сваю невінаватасць, калі яго не заб'юць». А таксама, што ведае чалавека ў праваахоўных структурах, які можа даказаць, што крымінальную справу супраць фірмы «Ніка-транс», уладальнікам якой быў Аўтуховіч, завялі па замове «зверху». Па словах Аўтуховіча, яшчэ да 2005 года тагачасны кіраўнік Дэпартамента фінансавых расследаванняў Дзяржкантролю Анатоль Грамовіч нібыта даў загад свайи падначаленым завесці такую справу. Летась былы начальнік Дэпартамента фінансавых расследаванняў Дзяржкантролю Анатоль Грамовіч быў асуджаны да зняволення па справе аб злоўжываннях мытнікаў у Брэсце.

Цікава, што патэнцыйная «ахвяра» замаху — былы старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Саўчанка расказаў, што аб падрыхтоўцы ў дачыненні да яго тэракту даведаўся толькі ад следчых. Яго паказанні выявілі супярэчнасці ў ранейшых сведчаннях Ларына, а сам Саўчанка заявіў, што да Аўтуховіча ніякіх прэтэнзій не мае.

Таксама сталі вядомыя акалічнасці затрымання аднаго з галоўных фігурантаў справы — Аляксандра Ларына, вакол паказанняў якога грунтуецца абвінавачванне. Ларын быў затрыманы 31 студзеня 2009 года як падазроны ў датычнасці да выбуху 4 ліпеня 2008 года ў Мінску. Ларын не прызнаваў сваёй датычнасці да гэтага інцыдэнту, як і да гранатамёту, што быў знойдзены ў Гродна ў 2005 годзе. Прызнальныя паказанні па справе Аўтуховіча Ларын пачаў даваць 24 лютага 2009 года. Нагадаю, што Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенку затрымалі 8 лютага 2009 года.

**Паводле «Радыё Свабода»**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ПА СТАРЫХ ШАБЛОНАХ

Сяргей Салаўёў

**Беларусы адсвяткавалі Вялікдзень — як каталіцкі, так і праваслаўны. Наперадзе яшчэ чатыры выходных. І зараз дарэчы згадваецца старая показка. «Ніколі не бывае так мала веруючых, як падчас посту, і так шмат, як на Вялікдзень». Не выключэннем сталі і гэтыя святы.**

Здаецца, Вялікдзень пачаўся 4 красавіка. І гэтым разам турботам пра вышэйшае, а не зямное, шмат часу прысвяціў Аляксандр Лукашэнка. Ён працягваў клапаціцца пра царкву нават 6 красавіка.

Дзяржава падтрымлівае і надалей будзе падтрымліваць дыялог рымска-каталіцкай і праваслаўнай цэркваў, заявіў Аляксандр Лукашэнка 6 красавіка на сустрэчы з мітрапалітам Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі Тадэвушам Кандрусевічам. Таксама былі абмеркаваны пытанні далейшага ўзаемадзеяння дзяржавы і рымска-каталіцкай царквы. Цяпер ідзе актыўная праца па падрыхтоўцы праекта пагаднення паміж Беларуссю і Святым Прастолам.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што стала добрай традыцыяй абмяркоўваць надзённыя праблемы з кіраўніцтвам адной з асноўных у краіне канфесій — каталіцкай. «Думаю, што гэта добры сігнал нашаму грамадству, — сказаў прэзідэнт. — Але я не хацеў бы, каб гэта сустрэча была проста паказальнай. Мы павінны абмеркаваць канкрэтныя пытанні, якія назбіраліся за мінулы год, і пагаварыць у цэлым пра сітуацыю ў сферы рэлігіі».

«Рады, што такія добрыя адносіны складаюцца паміж каталіцкай і праваслаўнай канфесіямі, для мяне гэта вельмі важна, я буду гэта падтрымліваць», — прыводзіць словы Лукашэнкі прэс-служба прэзідэнта. Кіраўнік дзяржавы пры гэтым асабліва адзначыў, што прысутнасць Тадэвуша Кандрусевіча на Вялікдзень у праваслаўным саборы, а таксама яго сумеснае з прэзідэнтам віншаванне праваслаўных вернікаў «былі годна ўспрынятыя ў грамадстве».

У сваю чаргу Тадэвуш Кандрусевіч падкрэсліў важнасць такога дыялогу з прэзідэнтам. Ён таксама сказаў, што пасля сустрэчы кіраўніка беларускай дзяржавы з Папам Рымскім Бенедыктам XVI «многія пытанні былі знятыя».

Каталікі, урэшце, малайцы. Як паведамляе прэс-сакратар Рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі ксёндз Аляксандр Амяльчэня, размова ішла не толькі пра лозунгі «добрасуседскіх адносінаў канфесій», але і пра канкрэтныя справы. На сустрэчы таксама абмяркоўвалася пытанне вяртання вернікам былога Мінскага кляштара бернардзінцаў з касцёлам — помніка архітэктуры барока XVII стагоддзя. Сябры рымска-каталіцкай абшчыны святога Язэпа шэсць гадоў праводзяць штодзённыя вячэрнія малебны за вяртанне вернікам гэтых будынкаў. Акцыя пачалася 19 сакавіка 2005 года, пасля таго, як стала вядома аб планах Мінгарвыканкама перадаць будынкі святыні інвестарам для прыстасавання пад гатэльны комплекс і аб'екты гандлёва-бытавога прызначэння. У 2007 годзе пад зваротам да кіраўніка дзяржавы за вяртанне манастыра вернікам было сабрана больш як 30 тысяч подпісаў.

Паводле інфармацыі Амяльчэні, кіраўнік дзяржавы даручыў упаўнаважанаму па справах рэлігій і нацыянальнасцей Леаніду Гуляку і выканаўцу абавязкаў старшыні Мінскага гарвыканкама Мікалаю Ладуцьку разгледзець узнятыя праблемы.

Можа, пасля станоўчага вырашэння гэтых праблемаў Беларусі пашэнціць прадпісаць Канкардат з Ватыканам?

І ўсё ж, нягледзячы на святы, жыццё працягвае ісці сваёй хадою. Праўда, хадою павольнай, сумнай і незаўважнай. Думалася раней, хоць мясцовыя выбары дададуць нейкай цікавасці да сітуацыі ў краіне. Дык не, усё сумна і спакойна.

У сакавіку Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў правёў нацыянальнае апытанне па мясцовых выбарах. У выніку атрымалася, што 76,5 працэнта апытаных увогуле нічога не ведаюць пра кандыдатаў, якія будуць балатавацца па іх акругах, а 36 працэнтаў рэспандэнтаў нават не ведаюць, калі ў краіне адбудуцца выбары ў мясцовыя саветы.

Як адзначае НІСЭПД, адна з прычынаў такога становішча — нізкі рэйтынг саміх мясцовых саветаў. 82,4 працэнта апытаных заявілі, што мясцовыя Саветы практычна не ўплываюць на іх жыццё (у тым ліку 46,2% — «зусім не ўплываюць», а «складана адказаць» на пытанне было толькі 3% апытаных). Амаль дзве трацiны рэспандэнтаў не ведаюць дагэтуль, каго яны абралі дэпутатам чатыры гады таму.

Тым часам, Міністэрства юстыцыі цалкам прадказальна ў чарговы раз адмовіла ў рэгістрацыі «Маладому фронту». «Згодна са звесткамі, якія маюцца ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь, 43 заснавальнікі МГА «Малады Фронт» (больш за палову ад іх агульнай колькасці), у тым ліку амаль усе сябры кіруючага органа дадзенага грамадскага аб'яднання, прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці, многія з іх неаднаразова, у тым ліку за правапарушэнні, звязаныя з парушэннем грамадскага парадку, правоў і свабод другіх асобаў (старшыня МГА «Малады Фронт» Дашкевіч Д.В. — 16 разоў, Шыла І.У. — 17 разоў, Самойлава К.С. — 13 разоў, Карноў Д.Э. — 11 разоў і г.д.). Вышэйазначанае не сведчыць аб намеры заснавальнікаў МГА «Малады Фронт» ажыццяўляць дзейнасць у межах заканадаўства Рэспублікі Беларусь, не парушаючы грамадскі парадак, правы і законныя інтарэсы другіх грамадзян», — напісана ў адмове.

Што ж, добра хаця б тое, што Мінюст падлічыў, колькі хто разоў «сядзеў». Прынамсі, зараз маладафронтаўцы будуць ведаць сваіх «аўтарытэтаў». Шкада толькі яны не ўзгадалі, што галоўны «пахан» МФ Дзмітрый Дашкевіч «матаў тэрмін» па «крыміналцы», па артыкуле 193-1 за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

Ну і павесялілі нас ветэраны, якія пікетавалі «Народную волю». Абурэнне ветэранаў выклікалі публікацыі з «Народнай волі» фрагментаў мемуараў мінчаніна Іллі Копыла «Нябышына. Вайна». Мемуары распавядаюць пра перыяд сталінскіх рэпрэсій у перадваенныя гады і партызанскі рух у Віцебскай вобласці ў гады другой сусветнай вайны.



Фота Насці Машчавай

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ЭДУАРД ЗАНКАВЕЦ



Скандальны Міхаіл Захараў не будзе трэніраваць зборную Беларусі па хакею на чэмпіянаце свету ў Германіі, яго заменіць Эдуард Занкавец, які раней працаваў асістэнтам Глена Хэнлана ў зборнай Беларусі і Бары Сміта ў піцерскім СКА. Каментуючы прызначэнне Занкаўца, старшыня Федэрацыі хакея Яўгеній Ворсін сказаў, што «надышоў час даверыцца айчынным спецыялістам». «Нам не патрэбны замежны барын, які будзе прыязджаць да нас на 10–15 дзён. Мы што, хворыя ці кволыя? За час працы з паўночнаамерыканскімі трэнерамі і нашы спецыялісты набраліся досведу», — лічыць кіраўнік Федэрацыі хакея.

Новы трэнер нацыянальнай зборнай па хакеі Эдуард Занкавец расказаў журналістам, што доўга не думаў над прапановай Ворсіна, і ўхваляе рашэнне кіраўніцтва федэрацыі ўключыць у трэнерскі штаб Уладзіміра Цыплакова, Андрэя Гусава і Аляксандра Андрыеўскага: «Я толькі «за» супрацоўніцтва з гэтымі спецыялістамі. Яны не толькі добрыя людзі, але і выдатныя хакейныя прафесіяналы». Што тычыцца складу нацыянальнай зборнай і тактыкі каманды, то на чэмпіянаце свету «хутчэй за ўсё, будзе зробленая стаўка на праверaных хлопцаў». «Натуральна, спадзяюся на прыезд нашых НХЛаўцаў. Ад іх будзе многае залежаць, — падзяліўся трэнер арганізацыйнымі планамі з «Еўрарадыё». — Я мае намер прытрымлівацца сістэмы, якую Хэнлан прышчапляў камандзе. Вядома, з'явяцца некаторыя карэкціроўкі, але яны не будуць мець глабальнага характару».

### ЯН МІХАЙЛАЎ



Суд Мінскага раёна паўторна разглядае справу верніка габрэйска-місіянскай царквы «Новы запавет» Яна Міхайлава, які з рэлігійных меркаванняў адмаўляецца служыць у войску. Паводле мінулага прысуду Ян Міхайлаў ужо адсядзеў за кратамі пяць месяцаў за ўхіленне ад службы ў войску, за 5 дзён да вызвалення вердыкт быў адменены судом вышэйшай інстанцыі па патрабаванню адваката асуджанага. Цяпер ідзе паўторны разгляд справы, і суд апытвае сведак — пастара суполкі верніка ды вайсковага камісара Мінскага раёна. Штогод у Беларусі ўзнікае некалькі падобных канфліктных спраў, калі ў шэрагах прызыўнікоў з'яўляюцца ідэйныя пацыфісты.

Летась пачалася кампанія «За альтэрнатыўную грамадзянскую службу», якая дамагаецца прыняцца адпаведнага закона, што рэгуляваў бы магчымасць асобам, якія не могуць з ідэйных меркаванняў трымаць у руках зброю, сплаціць грамадзянскі абавязак у іншай форме. Пэўнай заслугай актывістаў гэтай кампаніі ёсць факт таго, што напрыканцы сакавіка распараджэннем прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь была створаная міжведамасная працоўная група для падрыхтоўкі праекту Закона Рэспублікі Беларусь «Аб альтэрнатыўнай службе».

### МІХАІЛ ТУМЕЛЯ



Гадавы бюджэт мультыплікацыі Беларусі прыкладна роўны чвэрці бюджэту мультфільма «Шрэк» — раскрыў фінансавыя і творчыя таямніцы айчынных вытворцаў мультфільмаў перад прафесійным святам — Днём аніматара — вядомы рэжысёр-мультыплікатар Міхаіл Тумеля. «Я думаю, беларускія блокбастары, якія пераўзыдуць «Шрэка», з'явяцца не хутка. Гэта пытанне пакаленняў, пытанне арганізацыі: над стварэннем такіх фільмаў, як «Шрэк», фільмы студыі «Pixar», працуюць гіганцкія каманды добра падрыхтаваных спецыялістаў, з найскладанейшай сістэмай падзелу працы, з творча-тэхнічнай задачай, якая і няпростая, і дарагая, і мусіць рабіцца хутка, каб гэта ўсё акуплялася, — расказаў у інтэрв'ю парталу tut.by майстар.

Міхаіл Тумеля лічыць, што для Беларусі больш характэрнае аўтарскае анімацыйнае кіно. Цяпер аніматары працуюць над праектам «Аповесць мінулых гадоў» — гэта невялікія сюжэты пра кожны беларускі горад, дзе распавядаецца аб яго гісторыі і аб тым, як ён атрымаў герб. Анімацыйныя формы выбіраюць самі аўтары. Гэты фільм у Суздалі на Адкрытым расійскім фэсце атрымаў прыз за лепшае выяўленчае рашэнне.

8 красавіка мінскія аніматары вырашылі зрабіць днём свайго прафесійнага свята і назвалі яго ў гонар святой Анімаісы, якую абралі апякункай сваёй прафесіі і творчасці.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ДАКУМЕНТ З ІНТЭРНЭТУ



Сяргей Нікалюк

**Паводле Канстытуцыі, кожны беларус мае права скардзіцца, чым ён рэгулярна і займаецца, і ў гэтым яму ўлада не перашкаджае, таму што сама зацікаўлена ў атрыманні скаргаў.**

Што робіць амерыканец, калі парушаюцца яго правы? Ён звяртаецца да свайго адваката. Таму не варта дзівіцца, што ў Нью-Йорку адвакатаў больш, чым ва ўсёй Японіі. А як дзейнічае беларус, калі патрапляе ў аналагічную сітуацыю?

Вось, да прыкладу, улады горада Мінска вырашылі зрабіць вуліцу Карла Маркса пешаходнай. Склалі план, які прадугледжвае стварэнне «цэнтраў вольнага часу» за кошт скарачэння жылога фонду, і прапанавалі жыхарам пераехаць у Лошыцу. Жыхары, зразумела, абурыліся. Іх наступныя дзеянні прадбачыць было нескладана. Людзі сабраліся, эмацыйна абмеркавалі бяду, якая іх напаткала, і напісалі калектыўную скаргу. Для яе дастаўкі адрасату не спатрэбіліся нават паслугі пошты, балазе рэзідэнцыя адрасата размешчана побач — на вуліцы, якая таксама носіць імя заснавальніка марксізму.

Аднак не варта думаць, што скаргі — гэта выключна народны жанр. Пачытайце стужку навінаў. У нас намеснікі прэм'ер-міністра скардзяцца дэпутатам парламента, тыя, у сваю чаргу, падчас парламенцкіх слуханняў скардзяцца ўраду. Выраз «Мінск скардзіцца» даўно ўжо стаў журналісцкім штампам. Традыцыйны і пералік скаргаў Мінска: цана на газ, мыта на нафту.

## Скарга як рэгулятар эканомікі

Чаму так адбываецца? Самае простае тлумачэнне — схільнасць скардзіцца беларусы атрымалі ў якасці эстафетнай палачкі ад савецкай эпохі. Паспрачацца з гэтым складана. У савецкага чалавека папросту не было іншага спосабу нагадаць начальству пра сваё існаванне, таму дзяржаўныя арганізацыі ўсіх узроўняў атрымлівалі лісты мяхамі. Для іх апрацоўкі меўся штат спецыялістаў, якія аналізавалі ўваходную плынь скаргаў, структуравалі яе і свае высновы перадавалі на наступны кіраўнічы ўзровень.

Але калі б скаргі ўзнікалі толькі па ініцыятыве знізу, дзяржава не стала б марнаваць рэсурсы на іх апрацоўку. Аднак уся справа ў тым, што сама дзяржава была зацікаўлена ў атрыманні скаргаў, таму што мела патрэбу ў зваротнай сувязі. У рынкавай эканоміцы зваротная сувязь ажыццяўляецца праз цэны. У дэмакратычных палітычных сістэмах адказныя за зваротную сувязь з'яўляюцца прадстаўнічыя органы ўлады і незалежныя СМІ. Але нічога гэтага ў СССР не было.

Убогія дамы-пяціпавярховікі («хрушчоўкі»), з якімі сёння не зразумела, што рабіць, — класічны прыклад працы інстытута скаргаў. Рашэнне пра прамысловае будаўніцтва жылля было прынята ў 60-я гады XX стагоддзя, калі на фоне поспехаў у заваяванні космасу аналіз скаргаў паказаў, што адставанне ў жыллёвай сферы дасягнула крытычна небяспечнага ўзроўню.

Безумоўна, бальшавікі не былі бацькамі-заснавальнікамі інстытута скарг. Прафесійныя гісторыкі знаходзяць яго карані яшчэ ў Кіеўскай Русі. Звярнуся па дапамогу да сацыёлага Вольгі Бяссонавай: «Яшчэ ў часы «палюддзя» рускія князі адпраўляліся з лютвой да падпарадкаваных плямёнаў, каб, па выразе Салаўёва, «выконваць свае абавязкі адносна народанасельніцтва». Па скаргах сваіх падданых князь вяршыў суд і расправу, змяняў велічыню даніны».

Раней мне ўжо неадназова даводзілася адзначаць, што ў аснове айчыннай эканомікі ляжыць прынцып канцэнтрацыі ўладай рэсурсаў з мэтай іх наступнага размеркавання. Як першая, так і другая стадыя ажыццяўляецца ў адпаведнасці з нормамі. Самі ж нормы ўсталёўваюцца падчас аналізу сустрэчнай плыні скаргаў: ад тых, у каго рэсурсы адбіраюць, і ад тых, каму яны накіроўваюцца. Перачытайце папярэдні абзац. Князь «змяняў велічыню даніны», аналізуючы скаргі сваіх падданых. Такім чынам, скаргі спрыялі ажыццяўленню няцэнавага рэгулявання эканомікі.

З княжацкіх часоў прайшло нямала гадоў, але ў сучаснай Беларусі ў гэтым плане нічога не змянілася. Кіраванне цэнтралізаванай беларускай эканомікай ажыццяўляе ўладная «вертыкаль», гэтакая іерархія начальнікаў і падпарадкаваных. Іерархія ў кіраванні спараджае іерархію скаргаў. Следствам гэтага стала ўключэнне механізму скаргаў ва ўсе эканамічныя структуры з мэтай пастаяннай карэкцыі рашэнняў, якія прымаюцца.

Вось і бегаюць шматлікія скаржнікі ад брыгадзіра да міністра па кабінетах. Нехта скардзіцца на адсутнасць аначаў, а хтосьці — на недахоп зваротных сродкаў. Аднаму замінаюць прыватныя прадпрымальнікі, і іншаму — транснацыянальныя карпарацыі. Але калі скаржнікі бегаюць, значыць, сістэма працуе, і частка скарг у тым або іншым выглядзе задавальняецца. У выніку шчаслівчыкі атрымліваюць жаданае шляхам «пажалавання», што падахвочвае іх пры першай жа магчымасці зноў прасіць пра тое ж, г. зн. скардзіцца.

## Тэлефануйце — і вам адкажуць

Нядаўна, калі я блукаў у інтэрнэце, мне патрапіўся дакумент з някідкай назвай «Агляд зваротаў грамадзян за студзень-чэрвень 2004 года». Прывяду цалкам яго першы абзац: «У Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у першым паўгоддзі 2004 года звярнулася з прапановамі, заявамі і скаргамі 2763 чалавекі: у пісьмовай форме — 1863, вуснай — 900».

Аб'ём дакумента — шэсць старонак. У ім маса статыстыкі: з якіх абласцей дайшлі скаргі, якая іх тэматыка (вылучана 16 намінацыяў), у якія камісіі парламента яны былі накіраваныя для разгляду. З дакумента я даведаўся, што ў Беларусі існуе не толькі закон «Аб зваротах грамадзян», але і адпаведны артыкул у Канстытуцыі. Прывяду яго цалкам: «Артыкул 40. Кожны мае права накіроўваць асабістыя або калектыўныя звароты ў дзяржаўныя органы. Дзяржаўныя органы, а таксама службовыя асобы абавязаны разгледзець зварот і даць адказ па сутнасці ў вызначаны законам тэрмін. Адмова ад разгляду пададзенай заявы павінна быць пісьмова матывавана».

Наяўнасць заканадаўчай асновы пад магчымасць скардзіцца і дазваляе казаць пра скаргі як пра адзін з базавых інстытутаў беларускага грамадства. Існуюць юрыдычныя нормы, якія ўсталёўваюць парадак працы са скаргамі. Выразна прапісаныя органы, якія вядуць прыём скаргаў і выносяць па іх адпаведныя рашэнні. Вызначаны прадмет абскарджання, г. зн. тое, на што дазволена падаць скаргу. Усталяваныя правілы прыёму і праходжання скарг, а таксама тэрміны іх разгляду і механізмы прыняцця па іх рашэнняў.

Але вернемся ў парламент. 1863 пісьмовыя скаргі за паўгода — гэта мала або шмат? Ісціна пазнаецца праз параўнанне. Напярэдадні рэферэндуму 2004 года Лукашэнка выступіў з дакладам «Бедных і безбароненых у нас быць не павінна!». Гэта своеасаблівы адказ кіраўніка дзяржавы на скаргі, якія паступаюць у адміністрацыю. Дык вось, па пытаннях жыллёва-камунальнай гаспадаркі за год у сярэднім прыходзяць 5–6 тысяч лістоў, што складае адну пятую ад іх агульнай колькасці. У выніку атрымліваем 25–30 тысяч лістоў на год. Гадавая карэспандэнцыя парламентарыяў амаль на парадак больш сціплая — 2,7 тысячы.

Усё лагічна. Беларусы — народ практычны. Яны і без чытання адмысловай літаратуры выдатна разбіраюцца, дзе знаходзіцца рэальная ўлада, а дзе — яе муляж. Працытую: «*Два года подряд, с началом отопительного сезона, администрацию буквально захлестывает шквал звонков от жителей поселков Вишневка, Юбилейный, Сухорукие, Привольный Минского района с жалобами на отсутствие отопления жилого фонда и объектов социально-культурного назначения*».

Ці азначае гэта, што рэальная ўлада аператыўна па кожнай скарзе прымае меры? Не будзем такімі наіўнымі. Жыхары Вішнёўкі тэлефанавалі два гады ў адміністрацыю, у выніку іх праблема патрапіла... у даклад кіраўніка дзяржавы. Ці дапамагло гэта яе вырашыць? Адпаведнай інфармацыяй я, на жаль, не валодаю. Але відавочна: сам дакладчык колькасцю і якасцю скарг застаўся задаволены, што і выказаў ва ўласцівай яму афарыстычнай форме: «*Политический итог — основные претензии людей к действующей власти из-за жилищно-коммунального хозяйства*».

## Ракіроўка старажытнагрэчаскіх традыцый

Апошняя цытата патрабуе каментару. Існуюць сотні дэфініцый паняцця «палітыка». Сам тэрмін паходзіць ад слова «поліс». А поліс, як адзначыў палітолаг Алег Хархордзін, процістаіць ойкасу, ад якога пазней утварылася слова «эканоміка». Старажытны грэк ішоў на агору займацца палітыкай, а праблемы ойкаса (ЖКГ па-нашаму) ён пакідаў дома. У сучаснай Беларусі спадчыну легендарных грэкаў творча перапрацавалі: палітыку ў нас выгналі з агоры на кухні, а на яе месца ўрачыста ўзнялі праблемы ацяплення ў Вішнёўцы. Такая ракіроўка і названая «палітычным вынікам».

Ёсць выдатная гісторыя пра тэлевізар. Днём вялікі начальнік дае сваім падначаленым указанні, што і як паказваць па тэлевізары. Увечары ён сам гэты тэлевізар глядзіць і на падставе ўбачанага робіць выснову пра падзеі, якія адбываюцца ў свеце. Са скаргамі тая ж праблема. Рацыянальныя беларусы выдатна ведаюць, каму і на што можна скардзіцца. Сярод 16 намінацый, вылучаных парламенцкімі аналітыкамі, няма ні адной палітычнай, таму іх «палітычны вынік» з «палітычным вынікам» адміністрацыі цалкам стыкуецца.

Інстытут скарг у Беларусі і сёння з'яўляецца адным з базавых. Калі яго выключыць, то ўся эканамічная канструкцыя, якую ў нас прынята называць «беларуская эканамічная мадэль», паваліцца, а разам з ёй паваліцца палітычная і сацыяльныя надбудова. У пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя так і здарылася, калі адладжаны механізм падачы і разгляду скарг пачаў даваць збоі.

Ці ўсведамляюць беларускія ліберальныя эканамісты сам факт існавання такога архаічнага механізму зваротнай сувязі? Відавочна, не. Ва ўсялякім разе мне ніколі нічога пра гэта ў айчыннай эканамічнай (зрэшты, як і паліталагічнай) аналітыцы чытаць не даводзілася.

«Слепата» ліберальных эканамістаў лёгка вытлумачваецца. Яны выгадаваныя на кнігах заходніх аўтараў. Аднак на Захадзе інстытут скаргаў даўно не з'яўляецца «горадаўтваральным». Ад яго засталіся толькі рожкі ды ножкі, і таму ён знаходзіцца на перыферыі інтарэсаў сур'ёзных даследчыкаў.

Што да простых беларусаў, то яны таксама не падазраюць наяўнасці інстытута скаргаў, як птушкі не здагадваюцца пра існаванне паветра, а рыбы — вады. Але на пытанне сацыёлагаў НІСЭПД: «Калі дзяржава парушыла Вашы правы, куды Вы ў першую чаргу звернецеся па дапамогу?» 16,4% заяўляюць, што ў Адміністрацыю прэзідэнта.

**ІНФАРМАЦЫЯ АБ ТЭМАТЫЦЫ ПЫТАННЯЎ, ЯКІЯ ЗМЯШЧАЮЦЦА Ў ВУСНЫХ І ПІСЬМОВЫХ ЗВАРОТАХ ГРАМАДЗЯН У ПАЛАТУ ПРАДСТАЎНІКОЎ (СТУДЗЕНЬ-ЧЭРВЕНЬ 2004 ГОДА)**

| Тэматыка пытанняў, закранутых у вусных і пісьмовых зваротах | Колькасць | % |
|---|---|---|
| Забеспячэнне законнасці і аховы правапарадку | 435 | 15,7 |
| Сацыяльнае забеспячэнне | 431 | 15,5 |
| Жыллёвая і камунальная гаспадарка | 346 | 12,5 |
| Пытанні наконт працы | 276 | 9,9 |
| Эканоміка | 179 | 6,4 |
| Адукацыя і навука | 139 | 5,0 |
| Ахова здароўя | 132 | 4,7 |
| Вайсковыя пытанні | 112 | 4,0 |
| Прапановы да законапраектаў | 115 | 4,1 |
| Пытанні аховы навакольнага асяроддзя | 100 | 3,6 |
| Аграпрамысловы комплекс | 62 | 2,2 |
| Культура і спорт | 37 | 1,3 |
| Будаўніцтва | 31 | 1,1 |
| Сувязь і інфарматыка | 11 | 0,4 |
| Транспарт | 3 | 0,1 |
| Іншыя пытанні | 315 | 11,4 |

САМАКІРАВАННЕ

# АЛЕСЬ ЛАГВІНЕЦ: РАЗУМЕЮ, ШТО АХВЯРУЮ СВАІМ АЎТАРЫТЭТАМ

Волга Хвоін

**Паспяховы палітык мусіць умець дарыць надзею на «светлае заўтра», своечасова расказаць тым, хто яго падтрымлівае, пра зробленую працу і выпраменьваць пазітыў. Часткова гэтыя складнікі мелі месца ў першай прэзідэнцкай кампаніі дзеючага кіраўніка Беларусі. Спрацавала. Цяпер новая палітычная генерацыя спрабуе згуляць па тых жа правілах і замест татальнай крытыкі ўсіх і ўсяго прапануе вырашэнне лакальных праблем. Магчыма, шырокай вядомасці і ўсеагульнай народнай падтрымкі гэта не прыносіць, але лаяльнасць і разуменне ў пэўных колах — так.**

Алесь Лагвінец добра ўпісваецца ў названую схему. Як палітолаг ён разумее, што чалавек публічны, а тым больш палітык, мусіць выклікаць эмоцыі пазітыўныя. Відаць таму, расказваючы нават пра не надта аптымістычныя рэчы, ён ужывае словы са станоўчым адценнем. Паліттэхнолаг і дарадца Аляксандра Мілінкевіча насамрэч з'яўляецца, так бы, мовіць больш маладой копіяй экс-прэтэндэнта на пасаду прэзідэнта Беларусі. І калі ў руху «За свабоду» у Алеся Лагвінца роля непублічная, то ў палітыцы мясцовага ўзроўню ў яго ёсць магчымасць быць на першым плане. У сваім ЖЖ Лагвінец піша, што мае


Алесь Лагвінец

амбітныя мары стаць дэпутатам парламенту ад Сухараўскай акругі Мінска, а пазней — міністрам еўрапейскай інтэграцыі Беларусі, які будзе распрацоўваць і падпісваць пагадненне аб далучэнні Беларусі да Еўрапейскага саюза.

Адлік сваёй палітычнай кар'еры Алесь вядзе ад 2004 года, калі адначасова праводзіліся выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі і Рэферэндум па скасаванні абмежаванняў аб колькасці магчымых прэзідэнцкіх тэрмінаў. Тады Лагвінец правёў даволі актыўную кампанію. Афіцыйна яму была напісаная падтрымка блізу дзесяці тысяч выбарцаў. Гаворыць, што гэтыя галасы былі моцным стымулам, каб не спыняцца.

У 2007-м малады палітык паспрабаваў прайсці ў мясцовыя саветы. Дэпутацкі мандат, праўда, не займеў, затое ў сталічным мікрараёне Сухарава, дзе жыве Алесь, пабудавалі паліклініку, што і было адным з ключавых пунктаў яго перадвыбарчай праграмы. У 2008 годзе на парламенцкіх выбарах Лагвінец не змог прайсці рэгістрацыйны бар'ер, але сваім выбарцам паабяцаў балатавацца і надалей, бо «лічыць неабходным выкарыстоўваць кожную магчымасць, каб сустракацца, паказваць, што ёсць станоўчая альтэрнатыва, прапагандаваць ідэі і адстойваць іх інтарэсы».

Сёлета кандыдат «пераможны» момант рэгістрацыі і расказвае пра грандыёзныя планы пабудаваць у Сухарава шматфункцыянальны адкрыты комплекс для актыўнага адпачынку і пашырыць дарогу, якая вядзе ў бок цэнтра горада. Дарэчы, акруга папулярная — тут балатуюцца ажно сем прэтэндэнтаў: чацвёра ад улады і трое ад дэмакратычных сілаў. Праўда, наконт дэпутацкага мандату Алесь ілюзіяў не мае:

— Ніводнага чалавека з прапанаваных намі 13 асобаў не ўключылі ў склад участковых камісіяў. Я разумею, што як дэпутат я буду няўтульны для мясцовых уладаў, бо занадта актыўны. Ідэя з пабудовай адкрытага комплексу для актыўнага адпачынку прыйшла не адразу. Спачатку я меркаваў прапанаваць пабудаваць на пустцы нармальную горку для дзяцей. Але пасля знаёмы архітэктар развіў маю ідэю. У выніку мы склалі праект, паводле якога ў Сухарава можна пабудаваць парк актыўнага адпачынку, які будзе выкарыстоўвацца ў культурных і спартыўных мэтах. Галоўнае — унесці яго ў генеральны план забудовы горада. Пасля трэба ўжо шукаць сродкі. Гэта гучыць неверагодна, але можна было б паспрабаваць знайсці грошы праз праграму «Усходняе партнёрства», ці прынамсі пашукаць камерцыйнага інвестара. Мясцовага самакіравання як такога, на жаль, няма. Органы ўлады падсправаздачныя тым, хто іх прызначае. Мясцовыя саветы могуць нязначна ўплываць на фарміраванне мясцовых бюджэтаў, і ўсё.

***— Хадзілі чуткі, што гэтыя выбары Вы вырашылі пусціць на самацёк. Няўжо зноў у дэпутаты дарога закрытая?***

— А я чуў, што спіс дэпутатаў Мінгарвыканкаму падпісвалі ў Адміністрацыі прэзідэнта. Калі так, то плёткі пра «самацёк» не маюць пад сабою грунту. Тым больш, што любая бюракратыя хоча спакою і стабільнасці, а мы гэтага не нясём. Відаць, можна было б дазволіць пэўным дэмакратам стаць дэпутатамі, каб праверыць, як працуе сістэма, і паказаць Еўропе перамены, але логіка мясцовай наменклатуры выключае такія магчымасці. Актыўных кандыдатаў не рэгіструюць ад пачатку, каб пазбегнуць магчымых праблем з імі ў будучыні. Цяпер я прывучаю выбарцаў да таго, што яны мусяць патрабаваць справаздачнасць ад дэпутатаў, кандыдатаў. У маёй камандзе — сябры, студэнты, людзі, якія жывуць у акрузе. На пікеты па збору подпісаў прыходзіла 10–14 чалавек. Масавасць — важны псіхалагічны момант.

***— Маючы досвед, веды, валоданне мовамі, чаму вы не з'ехалі з Беларусі? Хіба тут больш магчымасцяў для самарэалізацыі?***

— Я там быў і вярнуўся. Мая Радзіма дазваляе мне дасягнуць намнога больш, чым калі б я жыў за мяжой. Апроч грошай ёсць момант прызнання. Я маю прызнанне сваіх студэнтаў, сваёй выбарчай каманды, сваякоў. Я адчуваю сябе больш камфортна тут, і значна большым беларусам, чым дзе-небудзь за мяжою. Канешне, часам бываюць моманты, калі апускаюцца рукі. Але ёсць сям'я, сябры, калегі. І яшчэ — мусіць быць крытычная самаацэнка таго, што робіш.

У Беларусі вузкая прастора, дзе можа быць палітычная дзейнасць. Палітыкі няма ў таталітарных рэжымах, у Беларусі рэжым аўтарытарны, і мы можам так ці інакш публічна выказвацца, удзельнічаць у выбарах. Канешне, у гэтай прасторы няма правілаў гульні, на ёй дамінуюць улады, яны ж вызначаюць, што можна аднесці да палітычнага дзеяння, а што не.

Мяне натхняе, што ёсць людзі, якія ў мяне вераць і дапамагаюць у маёй палітычнай кар'еры. І балатуючыся цяпер, я не хачу здраджваць папярэдняму даверу. Хаця разумею, што ў нечым ахвярую сваім аўтарытэтам. Мабілізую людзей, але ведаю, што выбараў як такіх не будзе. Гэта ўсё хутчэй робіцца, каб распаўсюдзіць альтэрнатыўную інфармацыю. Што пазітыўна і чаго не чакаў: на пачатку гэтай кампаніі я баяўся хадзіць збіраць подпісы, пры тым, што маю вялікі папярэдні досвед. Быў страх, што прыйду ў кватэры, дзе за мяне падпісваліся, а мне скажуць: «Колькі можна наступаць на тыя ж самыя граблі!». Але 90 працэнтаў з тых, хто мяне ўзгадваў, рэагавалі пазітыўна.

Улада разумее, што сама стварыла спажыўца, які аднойчы запатрабуе нечага новага, у тым ліку і новых правоў. Цяпер беларусы жывуць лепш чым калісьці, але поле для эканамічнага манеўру паступова звужаецца, і мы бачым, што ўсё ж адбываецца паступовы паварот да Захаду, сапраўды нейкая лібералізацыя ў эканоміцы. Толькі невядома, калі надыйдуць сапраўды якасныя перамены. Лукашэнка не вечны, хоць ён і унікальны палітык — зразумела, са знакам мінус. Ён умее быць вельмі падобным на сярэднягa беларуса. Таму спрабаваць абудзіць грамадскую свядомасць — адзін з нашых нямногіх шанцаў прыйсці да ўлады.

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# МЕЖЫ ЕЎРОПЫ ПА ЛЕЛУШУ

Вольга Хвоін

**«Сям'ю мы не выбіраем, але мы можам выбраць сваіх сяброў. Думаю, што ў Беларусі ёсць адно прызначэнне — вярнуцца ў сваю сям'ю, сям'я для Беларусі — гэта Еўропа», — заявіў падчас сустрэчы з журналістамі ў Мінску намеснік міністра замежных спраў Францыі па еўрапейскіх справах П'ер Лелуш. І дадаў: «Мы бачым Еўропу ад Брэста да Брэста!»**

Але геаграфія сцвярджае, што цяперашнія межы Беларусі сягаюць далей на Усход ад Брэста. Магчыма, гэтая агаворка мае на ўвазе акурат тыя сціплыя словы пра «пазітыўныя сігналы», якія Еўропа ўсё чакае ад Беларусі, а пакуль няма «сігналаў», то, як у паказцы, няма і «кампоціку», то бок ЕС да Смаленшчыны. І ўсё ж, як запэўніў дыпламат, Еўропа гатовая прагпягнуць руку Беларусі, каб дапамагчы краіне захаваць суверэнітэт ды не даць патрапіць пад поўную залежнасць Расіі. «У час, калі фінансавы крызіс скалануў Еўропу, а Беларусь шукае інвестараў, каб мадэрнізаваць сваю эканоміку, мы бачым патэнцыял для супрацоўніцтва», — зазначыў П'ер Лелуш. Рашэнне пачаць палітычны і эканамічны дыялог з Беларуссю кіраўніцтва Францыі прыняло яшчэ ў студзені, калі ў Парыж наведаўся першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка. У 2009 годзе тавараварот з Францыяй склаў 460,2 мільёна доляраў ЗША, беларускі экспарт — 67,5 мільёна доляраў, імпарт — 392,6 мільёна доляраў. Летась французскія кампаніі інвеставалі ў айчынную эканоміку 14,4 мільёна доляраў, прамымі інвестыцыямі — 752,3 тысячы доляраў.

У Мінску П'ер Лелуш сустракаўся з прадстаўнікамі Адміністрацыі прэзідэнта, Савета міністраў, знешнепалітычнага ведамства, а таксама з дзеячамі апазіцыі і грамадзянскай супольнасці. Дыпламат маўчаў наконт сваіх уражанняў ад перамоў з неафіцыйным Мінскам, а вынікам сустрэч з чыноўнікамі «быў вельмі задаволены». «Мы паставілі на рэйкі адносіны, якія вядуць да дабрабыту Еўропы», — запэўніваў намеснік міністра замежных спраў Францыі. Перамовы вяліся наконт сфер энергетыкі, транспарту, машынабудавання, сельскагаспадарчай галіны. Па выніках візіту французскай дэлегацыі віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка заявіў, што, магчыма, да будаўніцтва беларускай АЭС спрычыніцца французская кампанія «Areva». «Ведаючы досвед французскіх кампаній у галіне ядзернага будаўніцтва, атамных станцый, мы дапускаем магчымы ўдзел, напрыклад, такой кампаніі, як «Areva», у рэалізацыі гэтага праекта ў Беларусі. Дзверы адчыненыя», — заявіў Сямашка.

Варта зазначыць, што спадар Лелуш — першы прадстаўнік французскага ўраду, які наведаў суверэнную Беларусь. Дыпламат запэўніў, што «Францыя — сябар Беларусі», аднак падкрэсліў, што знешняя палітыка яго дзяржавы непадзельная ад агульнаеўрапейскай. Таму для Францыі важна, каб Беларусь была паўнавартасным удзельнікам парламенцкай асамблеі праграмы «Усходняе партнёрства» і актыўным удзельнікам самой праграмы. Наўзамен Еўропа чакае салідарнасці з палітыкай, якую праводзіць у дачыненні да іншых спраў. Як прыклад былі прыведзеныя санкцыі да Ірана з нагоды яго ядзернай праграмы. «Было б добра, калі б уся Еўропа паслала агульны сігнал іранскаму рэжыму», — падкрэсліў намеснік міністра замежных спраў Францыі.

Шматвектарнасць палітыкі Беларусі (якая апошнім часам асабліва кідаецца ў вочы — мы сябруем і з арабскімі краінамі, і з Лацінскай Амерыкай, і ў Еўропу масты наводзім) намеснік міністра замежных спраў Беларусі Валерый Варанецкі патлумачыў тым, што «знешняя палітыка — прагматычная рэч, якая адлюстроўвае гістарычны момант, пэўныя інтарэсы краіны», але ў прысутнасці французскага госця пагадзіўся, што «Беларусь належыць Еўропе».


П'ер Лелуш

Паводле дамоўленасці, у маі французскі бок плануе прыняць у сябе групу беларускіх парламентарыяў. У хуткім часе чакаецца візіт у Беларусь міністра культуры Францыі.

▸ З НАГОДЫ

# БАРЫС КІТ: Я ЗАЎЖДЫ НАЗЫВАЎ СЯБЕ БЕЛАРУСАМ



Фота Кастуся Лашкевіча TUT.BY

**6 красавіка споўнілася 100 гадоў самаму знакамітаму беларусу свету — выбітнаму навукоўцу і грамадскаму дзеячу Барысу Кіту. Пры канцы сакавіка ў Франкфурце-на-Майне (Германія), дзе сёння жыве чалавек-легенда, з юбілярам сустрэліся рэдактар навін парталу TUT.BY Кастусь Лашкевіч і карэспандэнт «Новага часу» Генадзь Кеснер. Гутарка з Барысам Кітом доўжылася амаль дзве гадзіны. Сёння вашай увазе — першая частка гэтага інтэрв'ю.**

***— Барыс Уладзіміравіч, Вы дасягнулі такіх вяршыняў, былі ў вышэйшых колах у Еўропе і ў Амерыцы. Калі людзі пыталіся пра паходжанне, пра нацыянальнасць, што Вы ім адказвалі?***

— Я заўсёды гаварыў, што я выйшаў з Беларусі, з самай беднай вёскі, і гэтым ганаруся (усміхаецца). І мне Бог даў такое шчасце дасягнуць таго, што я дасягнуў у сваім жыцці.

У 1944 годзе я пакінуў Беларусь, але з'ехаў таму, што была вайна і наступала Чырвоная Армія. Я не хацеў застацца пад Савецкім Саюзам, таму што мне гэта пагражала вялікай небяспекай. І я разам з хваляй беларускіх уцекачоў скіраваўся на Захад. Спачатку мы ўцяклі ў Германію, а пазней з Мюнхена мы пераехалі ў Амерыку. Мне было лёгка трапіць у Амерыку, бо падчас нямецкай акупацыі я быў перасьледаваны немцамі, сядзеў у нямецкай турме…

Я нарадзіўся ў Пецярбурзе, у Расіі — гэта вялікая краіна. А калі краіна сапраўды вялікая, дык у Амерыку па квоце адтуль прымалі больш людзей. Вось я і выкарыстаў гэту расійскую квоту ды апынуўся ў Амерыцы. Там я хутка ўладкаваўся працаваць хімікам і адначасна дапамагаў на першых пачатках усім беларускім перасяленцам з Еўропы, заклаў цэлую беларускую калонію ў Саўт-Рыверы, куды з маёй дапамогаю пераехала каля 300 чалавек. А яны ўжо дапамагалі перасяляцца іншым. Вось так і стварылася тая беларуская калонія ў Амерыцы, якая ёсць і сёння.

***— Барыс Уладзіміравіч, Вы ўдзельнічалі ў першых касмічных перамовах паміж ЗША і Савецкім Саюзам. Першая сустрэча здарылася ў вашынгтонскім гатэлі «Шаратон» у 1960 годзе. Як гэта адбывалася, у якой атмасферы праходзілі тыя перамовы?***

— Мы ў Амерыцы хацелі развіць супрацоўніцтва з Савецкім Саюзам, таму што СССР выпусціў першы спадарожнік. Яны дасягнулі даволі высокага ўзроўню касманаўтыкі, таму амерыканскі ўрад увесь час запрашаў прыязджаць выдатных савецкіх даследчыкаў астранаўтыкі, і яны прыязджалі. У гатэлі «Шаратон» у Вашынгтоне адбылося менавіта першае спатканне, прыехала цэлая група савецкіх акадэмікаў, міністраў. І мне было даручана праводзіць гэты гістарычны першы сход паміж Саветамі і Амерыкай.

Абсалютна ніякай палітыкі мы там не праводзілі, але вялі адно толькі навуковую справу па касманаўтыцы, і вельмі-вельмі дружалюбная атмасфера была. Там не толькі развівалася супрацоўніцтва, але таксама і дружба паміж народамі — амерыканскім і савецкім. Я ганаруся тым, што быў першым старшынёй гэтага першага гістарычнага сходу. Я быў прызначаны праводзіць гэты сход з дзвюх



Фота Кастуся Лашкевіча TUT.BY

прычын: таму што ўжо меў даволі вялікі вопыт у астранаўтыцы — бо я працаваў перад гэтым у фірме «Nord-America Aviation» (самая знакамітая ракетная фірма), — і таму мяне паклікалі як эксперта. Плюс я вельмі добра ведаў рускую мову.

***— Ці не былі здзіўленыя прадстаўнікі Савецкага Саюза: Вы, падаецца, свой чалавек, але ў Злучаных Штатах? Ці не задавалі з гэтай нагоды нейкіх пытанняў?***

— Усе добра ведалі, што мы ўцякалі ад Савецкага Саюза, але гэта ніяк не перашкодзіла нам кантактаваць. НКВД не мела да гэтага ніякага дачынення (смяецца). Ніякіх праблем у мяне не было. Наадварот, я чуў ад свайго бацькі, які жыў у Беларусі, што да яго прыходзілі з НКВД і гаварылі: ваш сын — вялікі чалавек у Амерыцы, ён можа смела прыехаць да нас і працаваць, калі хоча. Але я быў у Амерыцы, мне гэта краіна больш падабалася, яна давала мне найвялікшыя магчымасці.

***— Вы займаліся піянерскімі даследаваннямі ў ракетным паліве. Гэтыя даследаванні былі засакрэчаныя ці не?***

— Безумоўна, частка даследаванняў была сакрэтная, а частка — не. Вядомасць мне прынесла тое, што я выдаў першы ў гісторыі падручнік па астранаўтыцы. Усё пачалося з таго, што яшчэ ў часы Вернера фон Браўна (нямецкі і амерыканскі вучоны, канструктар ракетна-касмічнай тэхнікі, якога яшчэ называюць «бацькам амерыканскай касмічнай праграмы» — Г. К.) у Германіі і пазней, напачатку майго знаходжання ў Амерыцы, усё яшчэ ўжываўся плыўкі алкаголь, маламоцныя палівы. Але ўжо з'яўляліся планы рабіць вялікія падарожжы, кшталту падарожжаў на Месяц і гэтак далей. Але з такімі палівамі на Месяц ляцець немагчыма, трэба было выдумляць нешта іншае. Вось і звярнулі ўвагу на плыўкі вадарод.

Аднаго дня да мяне прыходзіць начальнік (гэта быў недзе 1956 год) і кажа: паслухайце, Барыс (у Амерыцы мяне ўсе называлі па першым прозвішчы), у нас ёсць думка, што мы павінны пачаць пазнаваць іншыя магчымасці, мы звярнулі ўвагу на плыўкі вадарод; дай нам усе звесткі на гэты конт.

Мне далі пэўны час, і я пачаў збіраць усе магчымыя матэрыялы па бібліятэках, вырахоўваць сілу вадароду, усе цяжкасці, звязаныя з яго ўжываннем. Я напісаў вялікі рапарт, у якім выклаў усё, што мне стала вядома. І гэта сталася пачаткам усяго! (смяецца)

Гэтая справа мяне вельмі захапіла. Што такое толькі плыўкі вадарод? А можа яшчэ што ёсць? У выніку я напісаў цэлую кнігу пра максімальныя топлівы, якія патрэбныя, і гэтая кніга і сёння выкарыстоўваецца ва ўсім свеце, ва ўсіх ракетных цэнтрах. Па гэтай кнізе вучыліся ўсе інжынеры, якія будавалі месячны карабель "Апола". Так што і я браў удзел у стварэнні праекта "Апола" — найвялікшага дасягнення чалавецтва — падарожжа чалавека на Месяц.

Але было не толькі гэта. Пазней я перайшоў у іншую амерыканскую кампанію "ІТТ" (міжнародная тэлефонна-тэлеграфная фірма), якая займалася сувяззю. Там я працаваў над сувяззю з Месяцам. Я не толькі працаваў у бюро, але і ездзіў па ўсім свеце, выступаў на кангрэсах па гэтых нашых планах. Напрыклад, у Японіі ёсць праект «Развіццё сувязі з Месяцам». Мы займаліся таксама будаваннем сатэлітаў (спадарожнікаў) сувязі.

**— Калі Вы працавалі над палівам на аснове плыўкага вадароду, ці падпісвалі нейкія паперы, якія б забаранялі разгалошваць інфармацыю на пэўную колькасць гадоў? Было такое?**

— Натуральна. Такое ёсць паўсюдна. У кожнай фірме ёсць нешта сакрэтнае і нешта не сакрэтнае. Напрыклад, звычайная фірма нешта робіць, і яна не хоча, каб суседнія фірмы (канкурэнты) даведваліся, што робіцца тут у яе. Гэта нармальная з'ява.

**— А цяпер гэтыя абмежаванні для Вас па часе скончыліся?**

— І сёння ёсць пэўныя рэчы, якія засакрэчаныя. І дагэтуль ляжаць некаторыя мае працы, якія лічацца сакрэтнымі, што ёсць зусім нармальна. Скажу шчыра, што Амерыка не была такая сакрэтная, як Савецкі Саюз. Бо, напрыклад, Каралёў, які будаваў усю астранаўтыку, быў найбольш сакрэтным, бо ягонае прозвішча ўвогуле не ведаў ніхто ў свеце. Але ўсе ведалі, хто такі фон Браўн…

***— Вы потым напісалі кнігу па развіццю савецкай касманаўтыкі. Гэта была першая кніжка ў ЗША. Дзе Вы атрымлівалі, дзе знаходзілі інфармацыю для гэтага выдання? Якія былі доступы да інфармацыі?***

— З Савецкага Саюза дасылалі шмат кніг, шмат інфармацыі. Апроч таго, я працаваў у Вашынгтоне, а там ёсць Бібліятэка Кангрэса — найвялікшая ў свеце. Там цэлыя расійскія аддзелы, я туды хадзіў і атрымліваў усё, што трэба, калі гэта была не засакрэчаная інфармацыя. А сакрэтнай, натуральна, мы атрымаць не маглі.

***— А ці выходзілі на Вас прадстаўнікі савецкай касманаўтыкі ў больш познія гады? Ці былі прапановы вярнуцца ў СССР, супрацоўнічаць з адпаведнымі савецкімі структурамі і інстытуцыямі?***

— Не, не было. Дарэчы, я б і не пагадзіўся — з лепшага на горшае не паедзеш (смяецца).

***— У адным з інтэрв'ю Вы казалі, што ўсё сваё жыццё марылі вярнуцца ў Беларусь…***

— Духам вярнуцца. Тое, што я ўцёк у Амерыку, — гэта найвялікшае шчасце ў маім жыцці. Я захаваў сваё жыццё плюс дасягнуў найвялікшых вяршынь навукі. Нехта з пісьменнікаў сказаў, што «ён патрапіў у Амерыцы ў вока амерыканскага касмічнага гругана» (усміхаецца). Добра патрапіць туды ці не? Я спаткаў самых найвялікшых, знакамітых людзей свету. А пасля вайны ў Амерыку прыязджала шмат знакамітасцяў з усяго свету, і не толькі з Савецкага Саюза. Я, дарэчы, спецыяльна апекаваўся людзьмі з СССР. Я асабіста ведаў амаль усю савецкую эліту. Прыязджалі таксама з Германіі, напрыклад, Вернер Гейзенберг (фізік, стваральнік «матрычнай квантавай механікі Гейзенберга» — Г. К.).

Я наведваў таксама і атамныя кангрэсы, а не толькі астранаўтычныя. Быў адзін такі атамны кангрэс недалёка ад Нью-Йорку, у Рочэстары, куды з'ехаліся вучоныя з усяго свету, у тым ліку і Гейзенберг. Кіраваў кангрэсам адзін прафесар рочэстарскага універсітэту плюс прыехаў яшчэ і прадстаўнік Дзярждэпартамента ЗША — Барыс Кіт (усміхаецца), каб паглядзець, як усё адбываецца, і дапамагчы ўжо з дзяржаўнага боку. Я тады працаваў астранаўтычным дарадчыкам міністэрства паветраных сіл у аддзеле касманаўтыкі. У Вашынгтоне мяне добра ведалі, і вось званяць з Дзярждэпартамента: спадар Кіт, нам патрэбна дапамога. Прыязджаюць з усяго свету вялікія вучоныя і робяць вялікі атамны кангрэс у Рочэстары. Мы дасылаем Вас туды як дзяржаўнага дэлегата. Дапамагайце там, глядзіце, што робіцца.

Я прыехаў, а тутака па калідоры ходзіць нейкі чалавечак. Падыходжу да яго і кажу: я прадстаўнік дзяржавы, прыехаў, каб дапамагчы вам і гэтак далей. Можа, я вам патрэбны? Так, адказвае ён, вы нам патрэбны. Гэта і быў Вернер Гейзенберг. Маю цяжкасці з кватэрай, кажа ён, нешта мне не даюць. Як так? Мы пайшлі ў адпаведную службу. «Тэрмінова дайце кватэру гэтаму чалавеку! — запатрабаваў я. — Перад вамі стаіць несмяротнасць!» (усміхаецца).

***— А каго з вядомых людзей Вы яшчэ ведалі асабіста?***

— Вельмі многіх, цяпер ужо памяць не тая, усіх не ўзгадаеш. Я быў знаёмы не толькі з фон Браўнам. Напрыклад, прыязджаю на нейкі кангрэс, сядзіць чалавек, я падыходжу да яго і кажу: я — Барыс Кіт. Ён адказвае: а я — Месершміт (Вільгельм Эміль Месершміт — нямецкі авіяканструктар і вытворца самалётаў-знішчальнікаў — Г. К.). Вось такія людзі (усміхаецца).

Найбольш я супрацоўнічаў з Тэадорам фон Карманам (стваральнік сучаснай аэранаўтыкі — Г. К.), гэта быў мой самы вялікі сябра. Ён напісаў уступнае слова ў маю кнігу. Ён быў тады дырэктарам авіяцыйнага камітэта пры NATO ў Парыжы, ён часта прыязджаў у Амерыку з выступамі ў Кангрэсе. Перад тым, як выступаць у Кангрэсе, ён званіў мне і прасіў даслаць усе матэрыялы. І я яму рыхтаваў гэтыя матэрыялы. Мы вельмі моцна сябравалі і прыватна. Я дапамагаў яго сям'і ўладкавацца ў Амерыцы, калі яна пераехала з Венгрыі, я дапамагаў ім дастаць кватэру і ўладкавацца ў Вашынгтоне. Ён мяне вельмі любіў і апошнім разам прыехаў перад смерцю і хацеў мяне прадставіць перад усімі вучонымі Амерыкі. Была тады страшэнная зіма, машына круцілася на лёдзе, і я вырашыў не ехаць. Я тады апошнім разам яго бачыў. Ён паехаў дахаты праз Аахен (старажытная сталіца Германіі — Г. К.) і там, у Аахене, памёр. Тэадор фон Карман — бацька аэранаўтыкі, які пачынаў з маленькага самалёта на пачатку XX стагоддзя, а зараз, дзякуючы яму, мы маем усё!

*Працяг будзе*

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 12 КРАСАВІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

**07.15** Мультфільм "Пунсовенькая кветачка" (СССР).
**07.55** "Добрай раніцы, Беларусь!".
**09.00**, **12.00**, **15.00**, **19.00** Навіны.
**09.05** "Зорныя танцы". Мужчынскі сезон.
**10.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл "Мая праўда" (Украіна).
**11.30** Дакументальны фільм "Космас Івана Міско" ("Белвідэацэнтр").
**12.10** Гісторыка- біяграфічная драма "Зялёная карэта" (СССР).
**14.00** Жаночае ток-шоў "Жыццё як жыццё".
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.25** У свеце матораў.
**15.50** Канцэрт ансамбля "Харошкі".
**16.55** Ваенная драма "Вышыня 89" (Расія).
**19.25** "КЕНО".
**19.30** "Людзі сустракаюцца, людзі ўлюбляюцца..." Творчы вечар паэта Алега Жукава.
**21.00** Панарама.
**21.40** Камедыйная меладрама "Сабрына" (Германія-ЗША).

**07.00** АНТ прадстаўляе: "Наша раніца".
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** Контуры.
**10.10** Камедыя "Белыя росы".
**11.40** "Малахаў+".
**12.40** "Бясконцая гісторыя".
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Дакументальны фільм "Калі можаш, прабач".
**17.15** Фільм "Мой тата псіх".
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** "Здабытак Рэспублікі".
**00.10**-**00.50** "Прафесійны бокс".

**05.30** "Званая вячэра".
**06.20** "Раніца.Студыя добрага настрою".
**07.30** "СТБ-спорт".
**07.40** "Раніца.Студыя добрага настрою".
**08.20** "Тыдзень". Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.25** "Вялікі сняданак".
**10.00** "Вялікі горад".
**10.40** Фільм "Д Артаньян і тры мушкецёры". СССР, 1979 г.
**15.10** "Гарачы лёд".
**15.40** "Званая вячэра".
**16.30** "24 гадзіны".
**16.40** "Мітрапаліт Філарэт: служэнне Царкве і Айчыне".
**17.30** "Наша справа".
**17.45** Фільм "Адданы сябар". Украіна, 2008 г.
**19.30** "24 гадзіны".
**20.00** "СТБ-спорт".
**20.10** Фільм "Космас як прадчуванне". Расія, 2005 г.



**22.00** "Сталічны футбол".
**22.30** Фільм "Гадзіннік". ЗША - Вялікабрытанія, 2002 г.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Маладзевы камедыйны серыял "Універ" (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял "Каханне як каханне" (Расія).
**10.35** "Пра мастацтва".
**11.00** Школа рамонту.
**11.50** Пазакласная гадзіна.
**12.10** Бухта капітанаў.
**12.45** Крымінальная меладрама "Тэрарыстка Іванова" (Расія). 7- я-10-я, заключная, серыі.
**16.00** Тэлебарометр.
**16.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.20** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял "Каханне як каханне" (Расія).
**19.05** Дэтэктыўная камедыя "Людзі Шпака" (Расія).
**20.05** Калыханка.
**20.25** Маладзевы камедыйны серыял "Універ" (Расія).
**21.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.00** Хакей. Формула гульні.
**22.30** Прэм'ера. Трагікамедыя "Пеця па дарозе ў царства нябеснае" (Расія).
**00.10** Жывы гук.

**07.00** "Раніца Расіі".
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** "Атрад касмічных дварнякоў". Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** "Ранішняя пошта".
**12.00** Дэтэктыў «Апошні загад генерала».
**13.40** "Гарадок". Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**14.00** Весткі.
**14.30** Прэм'ера. "Два бакі адной Ганны". Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**15.20** "Гарадок". Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.50** Фільм "Станцыйны наглядчык".
**17.00** Весткі.
**17.15** "Кулагін і партнёры".
**17.50** Прэм'ера. "Карmеліта. Цыганскі запал". Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.25** Тэлесерыял "Лятучы атрад". Расія, 2009 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Прэм'ера. "Два бакі адной Ганны". Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**23.50** "Нічога асабістага". Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**00.05** "Весткі+".
**00.25**-**01.25** "Мой срэбны шар".

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал "Сёння раніцай".
**08.30** "Каралёў. Зваротны адлік".
**09.20** "Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень".
**10.00** Сёння.
**10.20** "Сярэдні клас".
**10.55** "Кулінарны паядынак".
**11.50** Дэтэктыўны серыял "Шпікі".
**13.00** Сёння.
**13.30** Драматычны серыял «Блудныя дзеці».
**15.05** "Выратавальнікі".
**15.30** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял "Вісякі".
**18.30** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял "Кодэкс гонару".
**21.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял "Гадзіна Волкава".
**23.25** Сёння.
**23.50** "Сумленны панядзелак".
**00.35** "Школа зласлоўя".

**09.30** Матаспартыўны часопіс.
**09.45** Супербайк. Чэмпіянат свету. Валенсія (Іспанія). Заезд 1.
**10.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Валенсія (Іспанія). Заезд 2.
**11.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. +105 кг. Мінск (Беларусь).
**12.30** Веласпорт. Велагонка Парыж - Рубэ. Францыя.
**14.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Турцыі. Турцыя. Этап 1.
**15.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Турцыі. Турцыя. Этап 2.
**17.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. 105 кг. Мінск (Беларусь).
**18.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. +105 кг. Мінск (Беларусь).
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**21.15** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**01.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. +105 кг. Мінск (Беларусь).

БЕЛСАТ

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.35** Госць «Белсату».
**17.55** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.55** «Тата генерал! Беспрытульныя дзеці ў расійскім войску», рэпартаж, 2007 г.
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.40** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.05** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Партрэт», дак. фільм, 2003 г., Германія.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**21.40** «Катынскія сведчанні», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**21.55** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**22.10** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**22.15** Фільматэка майстроў: «Пасля канца свету», маст. фільм, 1998 г., Балгарыя.
**00.00** Аб'ектыў.

## 13 КРАСАВІКА, АЎТОРАК

**07.55** "Добрай раніцы, Беларусь!".
**09.00**, **12.00**, **15.00**, **19.00** Навіны.
**09.05** Слова Мітрапаліта Філарэта на Радаўніцу.
**09.15** Прэм'ера. Дакументальны фільм "Простая гісторыя" ("Беларусьфільм").
**09.45** Кінааповесць "Заўтра была вайна" (СССР).
**11.15** Nota Bene.
**11.45** Спецыяльны рэпартаж АТН "Мулявін. Шлях да "Малітвы".
**12.10** Меладрама "Данская аповесць" (СССР).
**13.55** Дакументальны фільм "Нарадзіўся я ліцвінам" ("Белвідэацэнтр").
**14.40** "OFF STAGE LIFE".
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.25** Адмысловы рэпартаж АТН "Дацягнуцца да нябёсаў".
**15.35** Вострасюжэтная ваенная драма "Вамзаданне" ("Беларусьфільм").
**17.10** Меладрама "Падаруй мне месяцовае святло" (Расія).
**19.25** "КЕНО".
**19.30** Сфера інтэрэсаў.
**19.50** Дакументальна-біяграфічны цыкл "Мая праўда" (Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.40** Крымінальная меладрама "Трынаццаць месяцаў" (Украіна-Расія).

**07.00** АНТ прадстаўляе: "Наша раніца".
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** Фільм "Бацька і сыны".
**11.40** "Малахаў+".
**12.40** "Бясконцая гісторыя".
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прыгодніцкі фільм "Турэцкі Гамбіт".
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05**-**00.55** Меладрама "Коко Шанэль". Францыя-Вялікабрытанія-Італія, 2008 год.

**06.50** "Казка аб цары Салтане". Мультыплікацыйны фільм.
**07.40** "Сталічны футбол".
**08.10** "Званая вячэра".
**09.00** Фільм "Космас як прадчуванне". Расія, 2005 г.
**10.30** "Нацыянальны здабытак". Храмы Беларусі.
**11.00** Фільм "Мушкецёры 20 гадоў пасля ". Расія, 1992 г.
**16.30** "24 гадзіны".
**16.40** "Званая вячэра".
**17.40** Фільм "Дні надзеі" Украіна, 2007 г.
**19.30** "24 гадзіны".
**20.00** Фільм "Чарадзейная краіна". ЗША-Вялікабрытанія, 2004 г.



**22.00** "Ля парадная пад'езда".
**22.30** "Аўтапанарама".
**22.50** Фільм "Двойчы ўчора". Германія-ЗША-Францыя-Вялікабрытанія-Іспанія, 1998 г.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** "Прыступкі". Дакументальны фільм (Беларускае тэлебачанне).
**08.30** Серыял "Каханне як каханне" (Расія).
**09.25** Меладрама "Чужая радня" (СССР).
**11.05** Прэм'ера. "Браслаўшчына. Край Божай апекі". Дакументальны фільм ("Белвідэацэнтр").
**11.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**12.25** Хакей. Формула гульні.
**12.55** "Лабірынты: святыя крыніцы".
**13.20** Канцэрт памяці Лучана Паварoці.
**14.50** "Дваццаць дзён без вайны". Кінааповесць (СССР).
**16.45** "Мама". Дакументальны фільм (Беларускае тэлебачанне).
**17.15** Прэм'ера. "Надзея як сведчанне жыцця". Крымінальная меладрама (Украіна). 1-я-4-я, заключная, серыі.




**20.25** Калыханка.
**20.45** "Крылы анёла". Меладрама (Украіна).
**22.40** "Ноч з Гаранам Брэгавічам" (Францыя).

**07.00** "Раніца Расіі".
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** "Кукрыніксы супраць Гебельса". Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.40** Тэлесерыял «Лятучы атрад». Расія, 2009 г..
**13.30** "Кулагін і партнёры".
**14.00** Весткі.
**14.30** Прэм'ера. "Два бакі адной Ганны". Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**15.20** Тэлесерыял «Я шпік».
**17.00** Весткі.
**17.15** "Кулагін і партнёры".
**17.50** Прэм'ера. "Карmеліта. Цыганскі запал". Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.25** Тэлесерыял «Лятучы атрад». Расія, 2009 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Прэм'ера. "Два бакі адной Ганны". Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**23.50** "Весткі+".
**00.10**-**01.00** Прэм'ера. "Генерал зорных войн". Дакументальны фільм.

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал "Сёння раніцай".
**08.30** "І зноў добры дзень!".
**09.25** "Чыстасардэчнае прызнанне".
**10.00** Сёння.
**10.20** "Сярэдні клас".
**10.55** "Кватэрнае пытанне".




**11.55** Дэтэктыўны серыял "Шпікі".
**13.00** Сёння.
**13.30** Вострасюжэтны серыял "План Б".
**15.10** "Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне".
**15.30** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял "Вісякі".
**18.30** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял "Кодэкс гонару".
**21.40** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял "Гадзіна Волкава".
**23.25** Сёння.
**23.50** "Галоўны герой прадстаўляе…".
**00.30** "Фатальны дзень".

**09.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**11.00** Веласпорт. Велагонка Парыж - Рубэ. Францыя.
**12.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. +105 кг. Мінск (Беларусь).
**13.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**15.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Турцыі. Турцыя. Этап 3.
**17.00** Снукер. Гран-пры. Глазга (Вялікабрытанія). Фінал.
**18.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. +105 кг. Мінск (Беларусь).
**21.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**22.00** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBO. Германія.
**00.00** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**00.15** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Прэв'ю сезону.



**00.45** Аўтаспорт. Гонкі Ле-Ман. Ле-Кастэйе (Францыя). Агляд.
**01.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.

БЕЛСАТ

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.35** МакраФон:
«Рок-карона–2009», ч. 1.
**18.20** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**18.50** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**19.30** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.40** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.10** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Сальда (эканамічная праграма).
**21.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.45** «Катынскія сведчанні», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**21.55** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**22.40** Форум (ток-шоў): «Не чакай мяне, пенсія!»
**23.20** Аб'ектыў.

## 14 КРАСАВІКА, СЕРАДА

**[1]**

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** "Добрай раніцы, Беларусь!".
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05-15.00** Тэхнічная прафілактыка.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН "Галактыка Fashion".
**15.55** Дэтэктыўны серыял "Мой асабісты вораг" (Расія). 1-я серыя.
**16.50** Меладраматычны серыял "Агні вялікага горада" (Расія).
**17.50** Камедыйная меладрама "Не нарадзіся прыгожай" (Расія).
**18.50, 00.00** "Зона Х". Крымінальная хроніка.
**19.25** "Спортлато 5 з 36". Забаўляльнае шоў.
**19.30** "КЕНО".
**19.35** Зямельнае пытанне.
**20.00** Дэтэктыў "Апостал" (Расія). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Ваенная драма "Застава Жыліна" (Расія). 1-я серыя.




**23.05** Фантастычны серыял "Героі-3" (ЗША).
**00.05** Дзень спорту.

**[ОНТ]**

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: "Наша раніца".
**09-05-16.00** Тэхнічная прафілактыка.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** АНТ прадстаўляе: "Міс Беларусь - 2010".
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** "Слова жанчыне". Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. "Цыганкі". Шматсерыйны фільм.
**22.15** "Крэм". Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** "Дакументальны дэтэктыў".
**00.05** "Жанатыя... з дзецьмі". Шматсерыйны фільм.
**00.50** Нашы навіны.
**01.05-01.15** Навіны спорту.

**[СТВ]**

**06.00** "24 гадзіны".
**06.10** "Раніца.Студыя добрага настрою".
**07.30** "24 гадзіны".
**07.40** "СТБ-спорт".
**07.45** "Раніца.Студыя добрага настрою".
**08.40** "Аўтапанарама".
**09.00-15.00** Прафілактыка.
**15.00** "Далёкія сваякі".
**15.35** "Званая вячэра".
**16.30** "24 гадзіны".
**16.50** "Новыя падарожжы дылетанта".
**17.20** "Міншчына".
**17.30** "Званая вячэра".
**18.30** "Мачаха". Серыял.
**19.30** "24 гадзіны".
**20.00** "Сталічныя падрабязнасці".
**20.10** "СТБ-спорт".
**20.15** "Добры вечар, маляня".
**20.25** Прэм'ера! "Салдаты. Дзембель непазбежны!" Серыял.
**21.30** Прэм'ера! "Водбліскі". Серыял.
**22.30** "24 гадзіны".
**22.55** "Мінск і мінчане".
**23.25** "Рэпарцёрскія гісторыі".
**23.50** Фільм "Крытычная маса". ЗША, 2000 г.

**[ЛАД]**

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы камедыйны серыял "Універ" (Расія).
**08.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35-15.00** Тэхнічная прафілактыка.
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.20** "Ноч з Горанам Брэгавічам" (Францыя).
**16.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.20** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял "Каханне як каханне" (Расія).
**19.05** Дэтэктыўная камедыя "Людзі Шпака" (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.15** Калыханка.
**21.35** Моладзевы камедыйны серыял "Універ" (Расія).
**22.10** Хакей. Чэмпіянат свету U-18. Швецыя - Беларусь.
**00.10** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. ФК Мінск - БАТЭ.

**[РОССИЯ]**

**07.00** "Раніца Расіі".
**09.00-15.00** Прафілактыка.
**15.00** Тэлесерыял «Я шпік».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** "Кулагін і партнёры".
**17.50** Прэм'ера. "Карменіта. Цыганскі запал". Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.25** Тэлесерыял «Лятучы атрад». Расія, 2009 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Прэм'ера. "Два бакі аднай Ганны". Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** "Весткі+".
**00.20-01.10** "1982. Маргарэт Тэтчэр". Дакументальны фільм.

**[НТВ]**

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал "Сёння раніцай".
**08.30** "Следства вялі…".
**09.20** "Іх норавы".
**10.00** Сёння.
**10.20** "Сярэдні клас".
**10.55** "Дачны адказ".
**11.55** Дэтэктыўны серыял "Шпікі".
**13.00** Сёння.
**13.30** Вострасюжэтны серыял "План Б".
**15.05** "Галоўная дарога".
**15.30** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял "Вісякі".
**18.30** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял "Кодэкс гонару".
**21.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял "Гадзіна Волкава".




**23.25** Сёння.
**23.50** "Позняя гутарка".
**00.30** "Першая кроў".

**[EUROSPORT]**

**09.30** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**09.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.30** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Лепшыя фіналы 1993-2000 гг.
**11.30** Снукер. Гран-пры. Глазга (Вялікабрытанія). Фінал.
**14.00** Футбол. Класіка Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Мілан (Італія) - Ліверпуль (Англія). Фінал 2005 года.
**15.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Турцыі. Турцыя. Этап 4.
**17.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Фінал.
**19.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Барселона 2008-2009 гг.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Лепшыя фіналы 2001-2009 гг.
**21.10** Абранае па серадах.
**21.15** Конны спорт. Кубак свету. Выездка. Хертагенбас (Нідэрланды). Фінал.
**22.15** Навіны коннага спорту.
**22.20** Гольф. Мастэрс (ЗША).
**23.20** Гольф. Еўратур. Адкрыты чэмпіянат Мадэйры. Мадэйра (Партугалія).
**23.50** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**23.55** Яхт клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.00** Штогадовая цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў прэміі " Laureus World Sports Awards". Абу-Дабі (ААЭ).
**01.00** Спартовыя бальныя танцы. Пpackзальны выступ. Сальса. Манака.

**[БЕЛСАТ]**

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.40** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**18.30** Аблічча таталітарызму: «Расія. ХХ стагоддзе. Погляд на ўладу», 2009 г., Расія: ч. 5 і 6.
**19.30** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.40** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.10** Дэмакратыя на штодзень: «Выбары – сімвал дэмакратыі».
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**20.35** Хто ёсць кім: Ігар Неўпакоеў.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Маю правы (прававая праграма).
**21.40** Катыньскія сведчанні.
**21.45** Без рэтушы: «Права на смерць», рэпартаж, 2009 г., Беларусь.
**22.00** «Катынскія сведчанні», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**22.15** «Сміла – адчуванне снегу», маст. фільм, 1997 г., Данія–Германія–Швецыя.
**00.10** Аб'ектыў.

## 15 КРАСАВІКАА, ЧАЦВЕР

**[1]**

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** "Добрай раніцы, Беларусь!".
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.05** Дэтэктыў "Апостал" (Расія). 1-я серыя.
**10.00** Меладраматычны серыял "Агні вялікага горада" (Расія).
**10.50** Камедыйная меладрама "Не нарадзіся прыгожай" (Расія).
**11.35** Алімпійскі часопіс.
**12.10** Меладрама "Танчы…" (Расія).
**14.05** Дакументальны цыкл "Фартыфікацыя" (Беларусь).
**14.40** "OFF STAGE LIFE".
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Уласнай персонай.
**15.55** Дэтэктыўны серыял "Мой асабісты вораг" (Расія). 2-я серыя.
**16.50** Меладраматычны серыял "Агні вялікага горада" (Расія).
**17.50** Камедыйная меладрама "Не нарадзіся прыгожай" (Расія).
**18.50, 00.00** "Зона Х". Крымінальная хроніка.
**19.25** "КЕНО".
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыў "Апостал" (Расія). 2-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.05** Ваенная драма "Застава Жыліна" (Расія). 2-я серыя.
**23.10** Фантастычны серыял "Героі-3" (ЗША).
**00.05** Дзень спорту.

**[ОНТ]**

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: "Наша раніца".
**09.05** "Слова жанчыне". Шматсерыйны фільм.
**10.00** "Крэм". Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** "Дэтэктывы".
**11.50** "Ералаш".
**12.00** "Малахаў +".
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** "Зразумець. Прабачыць".
**13.40** "Модны прысуд".
**14.45** "Кантрольны закуп".
**15.15** "Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу". Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. "Заручальны пярсцёнак". Шматсерыйны фільм.
**17.05** "Хай кажуць".
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** "Слова жанчыне". Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. "Цыганкі". Шматсерыйны фільм.
**22.15** "Крэм". Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** АНТ прадстаўляе: "Выбар +".
**00.00** "Жанатыя... з дзецьмі". Шматсерыйны фільм.
**00.45** Нашы навіны.
**01.00-01.10** Навіны спорту.

**[СТВ]**

**06.00** "24 гадзіны".
**06.10** "Міншчына".
**06.20** "Раніца.Студыя добрага настрою".
**07.30** "24 гадзіны".
**07.40** "СТБ-спорт".
**07.45** "Раніца. Студыя добрага настрою".
**08.30** "Салдаты. Дзембель непазбежны!" Серыял.
**09.30** "Я-вандроўца".
**10.00** "Пяць гісторый".
**10.30** "24 гадзіны".
**10.40** "Анёл-захавальнік". Тэленавэла.
**11.30** "Далёкія сваякі".
**11.45** "Званая вячэра".
**12.35** "Мачаха". Серыял.
**13.30** "24 гадзіны".
**13.50** "Фантастычныя гісторыі".
**14.40** "Свая каманда". Моладзевы серыял.
**15.40** "Водбліскі". Серыял.
**16.30** "24 гадзіны".
**16.50** "Добры дзень, доктар!".
**17.20** "Міншчына".
**17.30** "Званая вячэра".
**18.30** "Мачаха". Серыял.
**19.30** "24 гадзіны".
**20.00** "Сталічныя падрабязнасці".
**20.10** "СТБ-спорт".
**20.15** "Добры вечар, маляня".
**20.25** Прэм'ера! "Салдаты. Дзембель непазбежны!" Серыял.
**21.30** Прэм'ера! "Водбліскі". Серыял.
**22.30** "24 гадзіны".
**22.55** "Асабісты інтэрас".
**23.25** "Аўтапанарама".
**23.45** Фільм "Інферна". ЗША, 1999 г.

**[ЛАД]**

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы камедыйны серыял "Універ" (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял "Каханне як каханне" (Расія).
**10.35** Дэтэктыўная камедыя "Людзі Шпака" (Расія).
**11.30** Экспедыцыя.
**11.55** Бітва экстрасэнсаў.
**13.00** "Карта геаграфічных адкрыццяў". Дакументальна- пазнавальны фільм (Францыя).
**13.55** Рэпарцёр "Беларускай часіны".
**14.40** Мультфільм.
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.05** Жывы гук.
**15.45** Медычныя таямніцы.
**16.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.20** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым.
**18.00** Серыял "Каханне як каханне" (Расія).
**19.05** Дэтэктыўная камедыя "Людзі Шпака" ().
**20.05** Беларуская часіна.
**21.15** Калыханка.
**21.35** Моладзевы камедыйны серыял "Універ".
**22.10** Час футболу.
**22.40** Хакей. Чэмпіянат свету U-18. Беларусь - Канада.
**00.40** Культасвет.

**[РОССИЯ]**

**07.00** "Раніца Расіі".
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** "Вяртанне. Эдуард Хіль". Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Лятучы атрад». Расія, 2009 г..
**13.15** "Кулагін і партнёры".
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** Прэм'ера. "Два бакі аднай Ганны". Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**15.15** Тэлесерыял «Я шпік».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** "Кулагін і партнёры".
**17.50** Прэм'ера. "Карменіта. Цыганскі запал". Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.25** Тэлесерыял «Лятучы атрад». Расія, 2009 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Прэм'ера. "Два бакі аднай Ганны". Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** "Весткі+".
**00.20-01.10** Прэм'ера. "Ала Пугачова. Мужчыны яе Вялікасці". Дакументальны фільм.

**[НТВ]**

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал "Сёння раніцай".
**08.25** Праект "У пошуках Францыі".
**09.15** "Жаночы погляд".
**10.00** Сёння.
**10.20** "Сярэдні клас".
**10.55** "Вочная стаўка".
**11.40** "Прафесія-рэпарцёр".
**12.05** Дэтэктыўны серыял "Шпікі".
**13.00** Сёння.
**13.30** Вострасюжэтны серыял "План Б".
**15.05** "Прафесія-рэпарцёр".
**15.30** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял "Вісякі".
**18.30** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял "Кодэкс гонару".
**21.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял "Гадзіна Волкава".
**23.25** Сёння.
**23.50** "Алтар Перамогі".
**00.35** "Асабліва небяспечны!".

**[EUROSPORT]**

**09.30** Марафон. Мілан (Італія).
**10.00** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**10.30** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Манчэстэр 1998-1999 гг.
**11.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Фінал.
**14.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Манчэстэр Юнайтэд (Англія) - Чэлсі (Англія). Фінал 2008 года.
**15.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Турцыі. Турцыя. Этап 5.
**17.00** Снукер. Мастэрс. Лондан (Вялікабрытанія). Фінал.
**19.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Мілан (Італія) - Ліверпуль (Англія). Сезон 2006-2007 гг.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір WTA. 1/8 фіналу. Чарльстан (ЗША).
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Славакія/Klash 10th Anniversary.
**01.00** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**02.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).

**[БЕЛСАТ]**

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.30** «Рай Олі Гопнудла», маст. фільм, 1989 г., ЗША.
**19.00** Сальда (эканамічная праграма).
**19.20** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.30** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.00** МакраФон: «Рок-карона–2009», ч. 2.
**20.35** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Форум (ток-шоу): «Непаўнаспраўныя ў Беларусі».
**22.00** «Катынскія сведчанні», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**22.15** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял.
**23.00** Без рэтушы: «Права на смерць», рэпартаж, 2009 г., Беларусь.
**23.20** Аб'ектыў.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ІРАК: ВЫБАР ПАСЛЯ ВЫБАРАЎ

Алі Абед Алі, Алесь Лях

**Выбухі ў цэнтры Багдада 4 і 6 красавіка прагучалі якраз тады, калі прадстаўнікі чатырох партый, што перамаглі на парламенцкіх выбарах, пачалі кансультацыі наконт будучага прэм'ера. Але да тэрактаў у Іраку прызвычаіліся. Калі да гэтага ўвогуле можна прызвычаіцца...**



**Даведка:**

Айяд Алаўі нарадзіўся ў Багдадзе ў 1944 годзе, атрымаў медыцынскую адукацыю ў Багдадскім універсітэце, эміграваў. У 1989 годзе стварыў апазіцыйную групу, вярнуўся ў Ірак у ліпені 2003 года. Прэм'ер у Часовым урадзе, пры якім абраны Установчы сход, што распрацаваў новую Канстытуцыю. Галоўны ініцыятар вяртання іракцаў-бежанцаў на радзіму.

## ПЕРАМОГА КААЛІЦЫІ

Сярод насельніцтва 27-мільённай краіны дамінуюць арабы (55 працэнтаў — шыіты, але сунітаў, на якіх абапіраўся рэжым Садама Хусейна, таксама нямала — 18,5 працэнта), на поўначы вялікім анклавам пражываюць курды (21 працэнт, пераважна суніты). Кожныя выбары робіцца выпрабаваннем нацыянальна-рэлігійнага міру. Не сталі выключэннем і парламенцкія выбары 7 сакавіка гэтага года.

Цікава адзначыць, што выбары ў Іраку таксама праходзяць з датэрміновым галасаваннем. 5 сакавіка на ўчастკі прыйшоў 850-тысячны кантынгент іракскай арміі і сіл бяспекі, што мусіў ахоўваць спакой у асноўны дзень выбараў, упершыню без падтрымкі амерыканскага 150-тысячнага корпусу. І, як пагаджаюцца назіральнікі, даў рады — лічба ў 30 выбухаў і 38 ахвяр у дні галасавання меншая, чым у першыя парламенцкія выбары 2005 года. У суботу 6 сакавіка іракцы галасавалі і за мяжой — у 16 краінах. 7 сакавіка — усе астатнія. Яўка аказалася рэкорднай і ўзорнай нават для краін традыцыйнай дэмакратыі — 62 працэнты.

Пасля падліку, што цягнуўся да 26 сакавіка, пераможцам, насуперак прагнозам, стала апазіцыйная кааліцыя былога прэм'ера (2004–2005), шыіта Айяда Алаўі і «Аль-Іракія», якая пазіцыянавала сябе як ліберальна-патрыятычны свецкі блок шыіцкіх і суніцкіх партый. Яна атрымала 91 месца, упершыню ў гісторыі краіны засведчыўшы перавагу сілы, якая не дэкларуе канфесійных прыярытэтаў. Спробы прыцягнуць на свой бок сунітаў менш паспяхова рабіла і пераважна шыіцкая кааліцыя дзейснага прэм'ера Нуры аль-Малікі «Дзяржава закона» (на чале з яго ўласнай партыяй «Даава» і шэрагам такіх уплывовых асоб, як міністры нафтавай прамысловасці Хусейн аль-Шахрыстані і абароны Махамед аль-Мафрджы).

Лаяльны галоўнай знешняй сіле, ЗША, як і Алаўі, аль-Малікі, аднак, прадстаўляе традыцыяналісцкую сілу, што абапіраецца на ідэю канфесійнага і нацыянальнага падзелу ўлады і болып схільны да арыентацыі на шыіцкі тэакратычны Іран. Вынік аль-Малікі — 89 галасоў — падштурхнуў яго выказаць патрабаванні да Вышэйшай выбарчай камісіі наконт перападліку бюлетэняў уручную. Яго падтрымаў іракскі прэзідэнт-курд Джалаль Талабані, мяркуючы дамагчыся згоды між групоўкамі. Аднак кіраўнік камісіі Фарадж аль-Хайдары, апелюючы да прадстаўнікоў міжнароднай супольнасці, якія не заўважылі ў выбарчым працэсе сур'ёзных парушэнняў, адказаў адмовай.

Трэцяе месца ўзяў шыіцкі блок «Нацыянальны іракскі альянс» Амара аль-Хакіма, у які ўвайшлі і колішнія прыхільнікі ваеннага супрацьстаяння заходнікам з «арміі Махдзі» Муктады аль-Садра — 70 месцаў. Чацвёртае — курдскія партыі, аб'яднаныя па нацыянальным прынцыпе ў Курдскі спіс, — 43.

## АСАБЛІВАСЦІ ВЫБАРАЎ ПА-ІРАКСКУ

Дэвід Петрэус, галоўнакамандуючы сіламі кааліцыі ў Іраку з лютага 2007 па 2008 год, заўважыў: «Ікратыя — іракская форма дэмакратыі — абсалютна новая з'ява, але яна не пазбаўлена станоўчых рысаў». Галоўнае — палітычныя гульцы вымушаны мецъ дачыненні з электаратам, ствараць канкурэнтнае палітычнае поле. Тое-сёе падаецца смешным і дзівацкім — масавая раздача ежы, тавараў шырспажыву кшталту спартовага абутку ці тэлефонных картак, што практыкавалі ўсе канкурэнты, — не былі расцэнены як подкуп выбарцаў менавіта з-за ўсеагульнасці ўжывання гэтага ходу.

З другога боку, упершыню на выбарах у Іраку партыі ішлі не закрытымі спісамі з імёнамі лідэраў, а адкрытымі для кожнага выбарца персаналізаванымі табліцамі ўдзельнікаў кожнай кааліцыі. Гэтыя вялікія лісты мы бачылі на экранах у рэпартажах з Іраку. Аўтарытэт асобных кандыдатаў дазволіў шыітам часам галасаваць за сунітаў і наадварот, пераадольваючы канфесійны падзел. Да выбараў падключыліся пераважна суніцкія раёны Анбар, Масул, Кіркук, Салах-эд-Дзін. Суніты і ваенізаваная шыіцкая групоўка аль-Садра вярнуліся ў палітычны працэс, што складала сутнасць «дактрыны Петрэуса» па далучэнні прадстаўнікоў гэтых груповак да адміністрацыйнага кіравання ў рэгіёнах.



Аднак ніводная з груповак не атрымала рашучай перамогі на выбарах, іх лідэры варагуюць паміж сабой, і гарантыі стабільнасці не існуе. Ці зможа адзін з бакоў мірна сысці ў апазіцыю? Пакуль і аль-Малікі, і Алаўі дэкларуюць гатоўнасць будаваць кааліцыйны ўрад у супрацоўніцтве з Нацыянальным іракскім альянсам і Курдскім спісам і падтрымліваць надалей мірныя стасункі з краінамі рэгіёна. Але прафесар Каірскага універсітэта і кіраўнік аддзела лонданскага Міжнароднага інстытута стратэгічных даследаванняў па Блізкім Усходзе Маамун Фандзі выказваецца скептычна: «Дэмакратыя — плод, які не расце ў пустыні, арабская дэмакратыя і сама магчымасць яе існавання — нахабная няпраўда і самападман».

## ШТО БУДЗЕ

Іракскае заканадаўства прадугледжвае фармаванне новага ўраду кааліцыяй-пераможцай за 30 дзён. У выпадку беспаспяховасці намаганняў ініцыятыва перадаецца наступнай сіле. Праблема ў тым, што поспех можа быць дасягнуты толькі пры ўмове наяўнасці на баку кіруючага блоку не менш 163 месцаў у парламенце. І Алаўі, і аль-Малікі давядзецца дамаўляцца з іншымі — кансенсус паміж лідэрамі малаверагодны.

Амерыканцы, якія заплацілі за сваё знаходжанне ў Іраку жыццём ужо 4400 салдат і адным трыльёнам долараў, магчыма, аддалі б перавагу кааліцыі на чале са свецкім блокам Алаўі «Аль-Іракія». Гэта задавальняе і суніцкія сілы, якія ўпершыню з часоў Садама могуць вярнуцца да ўдзелу ў кіраванні краінай. Але ў палітыцы Алаўі ёсць відавочная хіба — яго свецкі падыход базуецца на арабскім нацыяналізме, што ставіць пад сумнеў спакойныя адносіны з трэцяй сілай — курдамі. Вяртанне сунітаў наўрад ці задаволіць шыіцкіх радыкалаў, пра што сведчыць рост гвалту ў Іраку апошнімі днямі.

Праблемы будуць узнікаць у любым выпадку. Пераход ініцыятывы па фармаванні кабінета да аль-Малікі коштам большай прыхільнасці да яго з боку Курдскага спісу і Нацыянальнага іракскага альянсу (у апошнім багата былых паплечнікаў аль-Малікі) цалкам верагодны. Абодва блокі падтрымлівалі ініцыятыву аль-Малікі па пераліку галасоў. Такі паварот выкліча масавую незадаволенасць сунітаў, якім па «плане Петрэуса» амерыканцы абяцалі спрыянне ў замен за адмову ад тэрарыстычнай дзейнасці і падтрымку ў барацьбе з «Аль-Каідай».

## АГУЛЬНЫЯ ЗАДАЧЫ

Хто б ні стаў на чале новага іракскага ўраду, патрэбна будзе вырашаць нялростыя задачы. Па-першае, пазбаўленне ад спадчыны войнаў з Іранам (1980–1988) і Кувейтам (1990–1991), якое дапаможа зняць з Ірака абмежаванні па самастойным гандлі нафтай, накладзеныя ААН. Для Ірака, другой з краін АПЕК па запасах нафты, гэта пытанне надзвычай важнае. Па-другое, вяртанне баяздольнасці арміі да поўнага вываду амерыканскіх войск. Па-трэцяе, рэалізацыя бягучага бюджэту ў 74,5 мільярда долараў, з прыярытэтамі па ліквідацыі беспрацоўя і адбудове энергасістэмы краіны. І, нарэшце, аднаўленне даверу міжнародных партнёраў у распрацоўцы нафтавых багаццяў, каб павысіць штодзённы экспарт нафтапрадуктаў з 2,5 да 12 мільёнаў барэляў.

Балючая кропка — правядзенне восенню гэтага года перапісу насельніцтва і вызначэнне рэферэндумам лёсу багацейшай на нафту правінцыі Кіркук. Яе магчымы адыход да Курдыстана пагражае расколам краіны. І Алаўі, і аль-Малікі кажуць пра далейшую дэмакратызацыю Ірака і ператварэнне яго ў мадэль дэмакратычнага грамадства на Блізкім Усходзе. Але не забудзем пра адно з палажэнняў папулярнай тэорыі «сутыкнення цывілізацый» Самуэля Хантынгтана — для краін мусульманскага свету мадэрнізацыя зусім не абавязкова цягне вестэрнізацыю.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Няхай не супакойваюць сябе некаторыя апартуністы тым, што ў горшым выпадку мы ідзем шляхам Беларусі. А чаму і не? Бацька атрымлівае газ амаль па расійскіх унутраных коштах, дазваляе сабе не прызнаваць Абхазію і Паўднёвую Асецію і дэманстратыўна цалуецца з Чавесам. Шматвектарнасць у дзеянні. Хіба гэта дрэнна? Аднак каб прэтэндаваць на лаўры Лукашэнкі, трэба як мінімум быць Лукашэнкам. Хіба нехта з Партыі рэгіёнаў або Блоку Літвіна здольны на гэта? Гэта вам не паміж фракцыямі бегаць.

**«Тиждень» (Украіна)**

Каментуючы пераможныя заявы пра перспектывы супрацоўніцтва, якія даносіліся з Венесуэлы і Бразіліі падчас турнэ Лукашэнкі, эксперты выказвалі сумневы адносна здзяйсняльнасці гэтых дэкларацый. Шмат хто казаў, што робіцца гэта, каб напалохаць Расію. Аднак сёння сумневаў ужо не застаецца: і Расія не спалохалася, і заявы Лукашэнкі — не бравада. У каляўрадавых колах Беларусі кажуць: «З Расіяй загадана сябраваць, але стаўку на яе не рабіць». З тым жа азартам, з якім беларускае чыноўніцтва дамагалася выканання сваіх інтарэсаў у рамках Саюзнай дзяржавы, яно ў хуткім часе будзе біцца за рынкі краін Лацінскай Амерыкі, Афрыкі і нават Еўропы. Дарэчы, еўрапейскія кантралёры ўжо не адзін раз прыязджалі інспектаваць беларускіх вытворцаў харчавання. Пра вынікі пакуль не паведамляецца, але калі працэс ідзе, то варта выказаць здагадку, што вынік таксама будзе.

**«Взгляд» (Расія)**

У пытанні мытаў на нафту Масква цвёрдая, як скала. Бясплатна Расія паставіць свайму суседу, як і сцвярджала раней, толькі 6,3 мільёна тон нафты. За астатнія тоны «чорнага золата» давядзецца плаціць. Беларускі бок так і не змог змірыцца са стратай «халявы». Міністэрства юстыцыі краіны звярнулася з іскам-скаргай у Эканамічны суд СНД, які, праўда, выносіць толькі рэкамендацыйныя рашэнні. У такім нервовым становішчы павінен адбыцца дыялог Лукашэнкі і Мядзведзева. Хутчэй за ўсё, Бацька свядома абвастрае сітуацыю, каб у абмен на пустыя саступкі са свайго боку дамагчыся чагосьці істотнага ад Расіі.

**«Московский комсомолец» (Расія)**

У польска-беларускага партнёрства ёсць перспектывы з улікам гістарычнай рэтраспектывы. Толькі наўрад ці яго ў блізкай будучыні можна будзе назваць стратэгічным. Кропкі ўзаемнага эканамічнага прыцягнення здольныя нарадзіць рэнтабельныя праекты, аднак яны наўрад ці змогуць ураўнаважыць сілы процідзеяння. Перш за ўсё патрэбна ўлічваць, што Беларусь і Польшча знаходзяцца ў розных сістэмах каштоўнасцяў: Беларусь у так званай Саюзнай дзяржаве з Расіяй, Мытным саюзе, ЕўрАзЭС, АДКБ, а Польшча — у ЕС і NATO. Польшча з'яўляецца сябрам СГА, Беларусь — не. Таму Масква і Брусель заўсёды будуць прысутнічаць у беларуска-польскіх адносінах. І калі Брусель патэнцыйна можа адыграць канструктыўную ролю, то Масква — наадварот. У Расіі беларуска-польскае ці беларуска-ўкраінскае партнёрства ўспрымаюць як пошук васалам іншага сюзерэна.

**«Дзеркало тиждня» (Украіна)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ФРАНЦЫЯ. КАМУНІСТЫ РЭАБІЛІТУЮЦЦА

Напярэдадні 65-ай гадавіны перамогі над фашысцкай Германіяй Кампартыя Францыя намагаецца рэабілітаваць камуністаў часоў пачатку другой сусветнай вайны. Як вядома, з прычыны падпісання Пакту аб ненападзенні паміж Сталінам і Гітлерам у 1939 годзе камуністы ўсёй Еўропы, у тым ліку французскія, трактавалі вайну як імперыялістычную і не падтрымлівалі ўрады антыгітлераўскай кааліцыі. Больш таго: у акупаванай немцамі Францыі нейкі час нават дазваляўся выхад камуністычнай прэсы. Толькі пасля 22 чэрвеня 1941 года французскія камуністы актыўна ўключыліся ў антыфашысцкі супраціў. Цяпер, аднак, стала вядома, што немцы адразу вельмі асцярожна ставіліся да сяброў Кампартыі. Як мінімум трыста камуністаў былі кінутыя ў верасні 1940 года канцлагер у рэгіёне Мантыньяк-Ласко як «палітычна небяспечныя». Усе яны пазней былі забітыя. На днях у месцы знаходжання канцлагеру адбылася вялікая акцыя памяці першых камуністаў, што сталі ахвярамі пераследу нацыстаў. Нагадаем, што ў час акупацыі Францыі менавіта камуністы складалі галоўны касцяк супраціву. З-за колькасці забітых фашыстамі сваіх сяброў Кампартыя нават атрымала назву Партыя расстраляных.

**Па матэрыялах «Humanite» (Францыя)**

### ІСПАНІЯ. КАЛУМБ БЫЎ КАТАЛОНСКІМ ГАБРЭЕМ

Так лічыць гісторык Альфонса Энсесат, інтэрв'ю якога з'явілася ў аўтарытэтным іспанскім выданні «El Pais». Дасюль, як вядома, лічылася, што Калумб — выхадзец з італьянскай Генуі. Падставы казаць пра тое, што вялікі марак паходзіць з Каталоніі, даў гісторыку аналіз запісаў Калумба. У тэкстах Калумба шмат слоў, якія ўжываюцца выключна ў Каталоніі. Акрамя таго, там шмат выразаў, характэрных для мовы габрэяў, якія не мелі права спавядаць свой культ адкрыта і рабілі гэта тайна. Наступны аргумент звязаны з існаваннем у Каталоніі мястэчка Калом, выхадцы якога, як правіла, называлі сябе Калом або Каломб. Тэзісы Энсесата, зразумела, вельмі спрэчныя. У бліжэйшы час у Генуі адбудзецца канферэнцыя гісторыкаў, прысвечаная асобе Калумба, на якой таксама плануецца разглядзець тэорыі Альфонса.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

### УКРАІНА. У ЧАРНОБЫЛІ ЗРОБЯЦЬ КАЗІНО

Спікер украінскай Вярхоўнай рады Уладзімір Літвін падтрымаў ідэю вярнуць у краіну гульнявы бізнес, аднак прапанаваў свае варыянты. На яго думку, ім самае месца на далёкіх выспах або ў Чарнобыльскай зоне. Нагадаем, гульнявы бізнес ва Украіне быў забаронены з 25 чэрвеня 2009 года. Адначасова дэпутаты абавязалі выканаўчыя ўлады вызначыць некалькі зон, дзе гульні могуць быць дазволеныя. Аднак гэтага дасюль не зроблена. Новы кабінет, які фармуе Партыя рэгіёнаў, вырашыў пакончыць з праблемай. Як раней заявіў Міхаіл Бродскі, у хуткім часе плануецца прыняць закон, па якім ва Украіне зноў адкрыюцца казіно. Па яго словах, яны будуць знаходзіцца ў Крыму, дзе ёсць добрая інфраструктура для турыстаў, якая ўзімку прастойвае. Аднак крымскія ўлады выступілі супраць падобнай ініцыятывы, апасаючыся напліву крыміналу. Падтрымаў іх і спікер, аднак з іншай прычыны. «Нам трэба вызначыць месцы ва Украіне, дзе мы можам забяспечыць кантроль за ўездам і выездам з гэтай тэрыторыі, каб было адпаведнае дэкларыраванне гэтых грошай», — сказаў Літвін. Ён таксама ўжо прапанаваў такія месцы: выспы Тузла і Змяіны, зона адчужэння ЧАЭС. Пакуль яго прапанову не каментуюць. Між тым, рашэнне трэба прымаць аператыўна. Як заявіў раней той жа Бродскі, гульнявы бізнес неабходна аднаўляюць, каб сабраць грошы на чэмпіянат Еўра–2012.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

### ПОЛЬШЧА. «ЧАТЫРЫ ТАНКІСТА І САБАКА» Ў 3D




Міжнародная медыйныя эксперты падвялі вынікі прыколаў, якія размясцілі 1 красавіка розныя выданні планеты. Што толькі ні прыдумалі журналісты. Так, «Le Tribune» змясціла інфармацыю пра тое, што з-за крызісу на ўрадавым узроўні прынята рашэнне распрадаць некаторыя экспанаты Луўра. Польскае тэлебачанне абвясціла пра намер нямецкага рэжысёра Паўля Маэра перазняць вядомы серыял «Чатыры танкіста і сабака», прычым у фармаце 3D. Нават паведамілі пра час прэм'еры — восень 2014 года. Трэба адзначыць добры жарт агенцтва IOL з Паўднёвай Афрыкі. Яно распаўсюдзіла інфармацыю пра тое, што самалійскія піраты выразалі на дне Індыйскага акіяну сто метраў кабелю, праз які ў Афрыку ідзе інтэрнэт. Цяпер быццам злодзеі патрабуюць ад афрыканскіх дзяржаў мільярд долараў выкупу. Аднак, калі меркаваць па розыгрышах з маштабаў рэакцый на іх, то тут першае месца ў брытанскай BBC. 1 красавіка BBC заявіла, што маці Шэкспіра была з Францыі. Па той бок Ла-Маншу паверылі. Сенсацыю пракаментавау асабіста міністр культуры Францыі. У эфіры BBC ён паабяцаў, што Шэкспір як француз зойме паважнае месца ў французскай культуры.

**Па матэрыялах «Times»**

---

МЕРКАВАННЕ

# ВЯРТАННЕ КУЧМЫ

**Дэмакратычная грамадскасць Украіны б'е трывогу: з абраннем Віктара Януковіча на пасаду прэзідэнта пачалося паступовае вяртанне кучмаўскіх парадкаў. Наколькі можна верыць падобным апакаліптычным прагнозам? Пра гэта і іншыя аспекты ўкраінскай палітыкі журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з кіеўскім палітолагам Юрыем Дакукіным.**



***— Працытую фрагмент артыкула аўтарытэтнага ў дэмакратычных украінскіх колах часопіса «Тиждень»: «Калі не прыпыніць новую ўладу сёння, заўтра ўкраінцы прачнуцца ў СССР». Ці варта верыць заявам пра вяртанне палітычнай рэакцыі?***

— На дадзены момант уся рэакцыя абмежавалася арыштам 25-гадовага хлопца Каханоўскага, які аўтагенам намаляваў зорку на бюсце Леніна на платформе адной са станцый кіеўскага метро. Аднак Каханоўскага пасадзілі не за гэта, а за бойку з міліцыяй. Прычым усяго на два тыдні. Адначасова быў праведзены ператрус у журналісткі, якая вядомая сваімі кантактамі з экстрэмісцкай групоўкай нацыянал-аўтаномаў. Супраць апошніх таксама распачалі крымінальную справу за бойку з міліцыянтамі. Вось і ўсё. Пакуль назваць «рэакцыяй» гэта цяжка. Хутчэй, можна сказаць, што міліцыя выконвае свае прамыя абавязкі.

***— Як у такім выпадку можна разумець намер запарожскіх камуністаў паставіць помнік Сталіну?***

— Ідэя ўстаноўкі помніка Сталіну не звязана з пераездамі на Банкаўскай (вуліца, на якой знаходзіцца Адміністрацыя прэзідэнта Украіны). Лідэры Кампартыі папросту канстатавалі, што іх электарат скарачаецца да 3–4 працэнтаў. Прычым гэта, як правіла, пенсіянеры. Патрэбна яго кансалідаваць, каб не згубіць апошнія. Лепшае выйсце — вайна за сімвалы. Прычым, калі ў камуністаў было ўсё добра з рэйтынгам, яны, наадварот, вялі кампанію супраць культу Сталіна. Напрыклад, існавала забарона на прысутнасць сталінскіх партрэтаў на акцыях КПУ. Цяпер для папулярызацыі брэнда КПУ сярод старых людзей як мага часцей пачала выкарыстоўвацца сталінская сімволіка.

***— Зноў цытата. На гэты раз з улёткі, якую раздаюць зараз амаль каля кожнага кіеўскага ВНУ: «Хлопцы і дзяўчаты, час дзейнічаць! Міністрам адукацыі стаў свядомы расійскі шавініст і ўкраінафоб Дзіма Табачнік». Маю на ўвазе дастаткова рэзанансную кампанію за адстаўку цяперашняга міністра адукацыі. Ці сапраўды са з'яўленнем Табачніка Украіне пагражае «інтэнсіўная русіфікацыя?***

— На маю думку, «антытабачная» кампанія — спроба аранжавай апазіцыі заявіць пра сябе. Хутчэй, гэта Табачніку і Партыі рэгіёнаў патрэбныя такія акцыі. Што могуць рэальна прапанаваць яны свайму выбаршчыку ў час крызісу? Нічога, акрамя зменаў у галіне культурнай палітыкі. Той факт, што Захад краіны рэзка крытыкуе Табачніка, дапамагае яму заставацца сваім на Усходзе. Больш таго, раней з боку «данецкіх» існавала яшчэ і практыка штучнай падтрымкі нацыяналістычных выступаў. Дастаткова згадаць, што на грошы Партыі рэгіёнаў нейкі час існавала фактычна фашысцкая Сацыял-нацыянальная партыя Украіны. Зараз адзін з яе лідэраў спакойна працуе ў апараце ўраду.

***— Калі культура — адзіная галіна, дзе ўлада здольная нешта зрабіць, лагічна чакаць надання рускай мове статусу дзяржаўнай?***

— Культура і мова — тонкія катэгорыі. Задача ў тым, каб сапраўды нешта падкінуць рускамоўнаму электарату. Інакш праз пяць гадоў яго прадстаўнікі могуць запытаць у Януковіча і кампаніі: што вы зрабілі, каб за вас галасаваць зноў? З іншага боку, занадта правакаваць украінскі Захад было б неразумна. Таму трэба чакаць невялікай саступкі для рускамоўнай грамады кшталту права абітурыента здаваць іспыты ў ВНУ на той мове, якую ён вывучаў у школе. Ужо ёсць пастанова на гэты конт. Аднак — звярніце ўвагу! — напярэдадні выбараў уся бела-блакітная прэса крычала пра тое, што пасля перамогі руская мова стане дзяржаўнай. Цяпер пра гэта не ўзгадваюць. Затое актыўна апісваюць кампанію супраць Табачніка.

***— Як будуць будавацца адносіны з Масквой?***

— Ёсць думка пра тое, што Януковіч катэгарычна не сумяшчальны з Еўропай, ён ментальна блізкі да Масквы. Аднак па факту ўся наша бізнес-эліта ў ментальным плане больш блізкая да Масквы. У тым, дарэчы, і быў правал Ючшанкі, які спрабаваў стварыць сабе сацыяльную базу ў выглядзе сярэдняга бізнесу і праамерыканскага капіталу ва Украіне. Аказалася, што гэтая катэгорыя капіталістаў ідэйна неарганізаваная. Лепшы прыклад гэтаму — «пераходы тушак». Так называюць працэс у парламенце, калі дэпутаты ад БЮТ і «Нашай Украіны» (звычайна, прадпрымальнікі сярэдняй рукі) паасобку перабягаюць у стан Партыі рэгіёнаў. Аднак сяброўства з Расіяй — не азначае інкарпарацыю Украіны ў яе склад. Калі мы кажам пра новую рэдакцыю на Украіне мадэлі Кучмы, трэба казаць пра вяртанне да палітыкі балансавання і шматвектарнасці. І, паверце, гэта значна больш адэкватная лінія, чым празаходні курс Ючшанкі.

***— Як будзе, на Вашу думку, выглядаць арганізацыйны і ідэйны фармат аранжавай апазіцыі? Ці зменяцца лідэры?***

— Блок Юліі Цімашэнка паранейшаму застаецца флагманам апазіцыйнага лагеру. У кантэксце алігархічнай прыроды ўлады БЮТ відавочна будзе рабіць стаўку на сацыяльныя лозунгі. Зараз, дарэчы, бютаўцы актыўна выступаюць супраць новага больш ліберальнага праекту працоўнага кодэксу. У тым, што БЮТ не страціў сваіх пазіцый, вінавата сама Партыя рэгіёнаў. Былі перанесеныя прызначаныя на вясну выбары, і гэта парадвала дынаміку партыйнага будаўніцтва праектаў Цыгіпкі і Яценюка. Цыгіпка нават сышоў працаваць у кабінет, не бачачы перспектыў для сваёй партыі на бліжэйшы час. Застанецца на палітычнай мапе і Ючшанка. Ён са сваім наданнем Бандэры звання героя Украіны адразу пацэсніў ўсіх лідэраў нацыяналістычных партый. Дзякуючы наяўнасці ідэалогіі таксама захаваецца Кампартыя. Усе іншыя — сацыялісты, літвінаўцы, нацыяналісты Цягнібока — будуць сыходзіць у другую лігу. Звычайна партыі гэтага эшалону ва Украіне займаюцца выбарамі на месцах.

***— Ваш прагноз развіцця сітуацыі на бліжэйшыя пяць гадоў?***

— Як мінімум год у Партыі рэгіёнаў ёсць. Краіна стамілася ад аранжавых. Запатрабаваны спакой. Аднак ніякага рэцэпту Партыя рэгіёнаў прапанаваць не здольная. Калі заканчэнне каданцыі Януковіча храналагічна прыпадзе на выхад украінскай эканомікі з крызісу, ёсць шанец, што яго пераабяруць. Калі не — то не выключаю праз пяць гадоў новага Майдану.

ЦІКАВА

# ФУТБОЛУ НЕ БУДЗЕ?

Іван Біч

**Забойства лідэра паўднёваафрыканскіх расістаў напружыла сітуацыю ў краіне. Ходзяць нават чуткі, што Паўднёвую Афрыку могуць пазбавіць права праводзіць гэтым летам чэмпіянат свету па футболу.**



У 1993 годзе Крыс Хані, адзін з самых папулярных лідэраў Афрыканскага нацыянальнага кангрэсу (ANC), быў забіты чалавекам, блізкім да Руху супраціву афрыканераў (AWB), які заснаваў Юджын Тэрбланш. Чарнаскурая камуна была гатовая ўзяцца за зброю. Сітуацыю разрадзіў выступ тагачаснага прэзідэнта Нельсана Мандэлы. Ён звярнуўся да нацыі з заклікам захаваць міжрасавы і грамадзянскі мір.

На мінулым тыдні з падобнай заявай выступіў цяперашні прэзідэнт Джэйкаб Зума. Прычынай стала таксама забойства. Аднак на гэты раз забілі белага. Нябожчыкам аказаўся той самы Юджын Тэрбланш.

На першы погляд, тое, што адбылося на ферме Тэрбланша (прыкладна 100 кіламетраў на ўсход ад Ёханесбурга), далёка ад любой палітыкі. Юджын папросту мала заплаціў двум чарнаскурым батракам, якія працавалі ў яго на ферме. Хацеў, па іх словах, даць ім 300 рандаў (мясцовая валюта), хаця мінімалка ў Паўднёвай Афрыканскай Рэспубліцы (ПАР) складае 1600 рандаў. Пачалася спрэчка. Падчас яе ў двух хлопцаў не вытрымалі нервы. Яны выцягнулі нажы і літаральна спаласавалі імі цела 69-гадовага Юджына.

Але гэты інцыдэнт меў вельмі маштабныя наступствы. Пад пагрозай аказалася правядзенне гэтым летам самага буйнага спартовага мерапрыемства года — чэмпіянату свету па футболу.

Найперш таму, што абвясцілі мабілізацыю палітычныя паплечнікі Юджына. Юджын Тэрбланш быў адным з гістарычных лідэраў афрыканерскага нацыяналізму. Афрыканеры, або буры, — патомкі галандскіх каланізатараў, якія прыплылі ў Паўднёвую Афрыку ў XVII стагоддзі. Дзяржавы бураў былі ўключаны ў склад Брытанскай Імперыі ў выніку г. зв. бурскіх войнаў. З часам пасля таго, як Лондан надаў краю статус дамініёну, буры аднавілі сваё пазіцыі ў грамадстве.

Аднак былі дзівакі, якія лічылі, што жыццё ў адной дзяржаве з нашчадкамі брытанскіх каланістаў супярэчыць канонам афрыканерскага нацыяналізму. Яны выступалі за стварэнне асобнай Бурскай Дзяржавы — Boerestaat. Да іх належаў і Юджын — былы паліцэйскі афіцэр. У 1973 годзе ён палічыў, што рэжым Апартэіду занадта ліберальны, і стварыў Рух афрыканерскага супраціву. За гады дзейнасці рух зарэкамендаваў сябе як паслядоўная правая экстрэмісцкая групоўка, чыя дактрына грунтуецца на ідэях чыстага расізму. У часы Апартэіду сябры AWB займаліся тым, што дапамагалі паліцыі разганяць пратэсты чарнаскурых.

Цяжка назваць нябожчыка адэкватным палітыкам. Рух афрыканерскага супраціву выкарыстоўваў у якасці сімволікі нацысцкія сімвалы. Сам Юджын любіў з'яўляцца на партыйных мерапрыемствах на кані. Такім чынам, па яго словах, ён аддае знак пашаны бурам — героям вайны супраць Вялікабрытаніі. У 2001 годзе Юджын трапіў на 3 гады ў турму за тое, што амаль да смерці збіў чарнаскурага ахоўніка.

Зразумела, што з улікам маштабнасці фігуры Юджына сябры AWB, нават калі б той памёр ад удару маланкі, западозрылі нешта нядобрае. У нашым выпадку, на іх думку, забойства было палітычным. Забойцы дзейнічалі свядома, таму што… наслухаліся песняў. Маецца на ўвазе песня «Забей бура», якая не так даўно была абвешчана партыйным гімнам Моладзевай лігі ANC.

Дзіўныя музыкальныя густы Моладзевай лігі ANC не спадабаліся апазіцыйным партыям і шэрагу няўрадавых арганізацый. Яны дабіліся праз суд забароны выканання песні. Аднак, як сцвярджаюць афрыканеры, — джын ужо выпушчаны. Амаль уся чарнаскурая моладзь ахоплена ідэяй забіць белага чалавека.

Акрамя таго, не выключана, што паплечнікі Тэрбланша могуць паспрабаваць адпомсціць за смерць свайго лідэра. Эксперты вельмі скептычна разглядаюць магчымасць буйных мілітарных акцый з боку правых экстрэмістаў. Пасля 1994 года іхнія структуры страцілі сваю моц. Аднак забіць якога-небудзь папулярнага чарнаскурага палітыка яны здольныя. Гэтага будзе дастаткова, каб справакаваць расавыя пагромы.

Аднак ёсць значна большая праблема. Смерць прымусіла грамадства згадаць змрочную статыстыку. Кожны дзень у ПАР ад рук злачынцаў з чорнай скурай паміраюць 50 белых грамадзян. Галоўным чынам гэта адбываецца падчас нападаў на белых фермераў у правінцыі. Сітуацыя тут вельмі складаная. Яшчэ ў 1999 годзе Нэльсан Мандэла быў вымушаны правесці спецыяльнае пасяджэнне ўраду па пытанню атак чарнаскурай беднаты на белых плантатараў. У асяроддзі белых жыхароў ПАР папулярны міф пра тое, што тыя напады — частка глабальнага плану Кангрэса па знішчэнню белага фермерства.

Менавіта такім чынам у свой час правялі пераразмеркаванне зямлі з рук белых у рукі чорных у суседняй Зімбабве. Белых фермераў шляхам тэрору папросту прымусілі сабраць манаткі і з'ехаць са сваіх зямель. Сімвалічна, што за месяц да гучнага забойства апазіцыя зрабіла заяву пра тое, што выступы Юліуса Малемы, лідэра Моладзевай лігі правячай партыі ANC, правакуюць сельскую чарнаскурую моладзь на гвалт супраць белых фермераў.

Зрэшты, Малема на мінулым тыдні быў прыняты ў Харарэ зімбабвійскім дыктатарам Роберам Мугабе і выказаў захапленне ягонай аграрнай рэформай. Ён таксама назваў 9 мільёнаў белых, якія жывуць цяпер у ПАР, прычынай усіх сацыяльных праблем.

На цяперашні час сітуацыя застаецца вельмі нестабільнай. Усе лідэры бурскіх партый, у тым ліку партыі Дэмакратычны альянс, пераклалі адказнасць за забойства на арганізацыю Малемы. Між тым, да пачатку футбольнага чэмпіянату засталося два месяцы. Аднак нават калі зараз мір атрымаецца захаваць, няма ніякіх гарантый, што канфлікт не выбухне ў чэрвені, калі ў ПАР прыедуць дзесяткі тысяч белых турыстаў, сярод якіх будзе шмат агрэсіўных футбольных фанатаў.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ЛЕАНІД ЧАРНАВЕЦКІ



Мэр Кіева можа развітацца са сваёй пасадай. На разгляд Вярхоўнай рады Украіны паступіў законапраект «Аб сталіцы». Адзін з яго блокаў прысвечаны правілам абрання мэра Кіева. Фактычна ўсё робіцца так, каб не дапусціць пераабрання Чарнавецкага (нагадаем, што ў 2008 годзе ён здолеў пераабрацца пасля таго, як парламенцкая большасць, што падтрымлівала Цімашэнка, зняла яго з пасады). Галоўная рэформа тычыцца нормаў, па якіх мэр абіраецца адноснай большасцю гараджан. Менавіта гэты момант дазваляў Чарнавецкаму абыходзіць сваіх шматлікіх канкурэнтаў у 2006 і 2008 гадах. Пакуль канкурэнты сварыліся, ён мабілізаваў свой электарат — пенсіянераў, якім раздаваліся харчовыя пайкі. Цяпер мэра будуць абіраць у два туры. Да таго ж паўнамоцтваў у новага мэра будзе менш: старшыню гарадской адміністрацыі будзе прызначаць прэзідэнт. Нават калі Лёня Космас (мянушка мэра) і праврецца ў другі тур, яго шансы невялікія. Правал працы камунальных службаў мінулай зімой прывёў да падзення яго рэйтынгу і расколу яго атачэння. Між тым, самі кіяўляне не ведаюць, радавацца ці не магчымай адстаўцы Чарнавецкага. Ці будзе новы мэр лепшым — гэта яшчэ пытанне. Аднак дакладна з ім будзе не так весела, як з цяперашнім. Нагадаем толькі адно з яго славутых выказванняў: «Я ведаю, дзе якая прыбіральня будзе пастаўлена бліжэйшым часам. Я ўжо меў прэзентацыю гэтых месцаў. Людзям падабаецца, каб усё пахла кветкамі. Таму што прыбіральні — тонкая рэч».

### АБДУЛАЙ ВАД



Прэзідэнт Сенегала пасварыўся з апазіцыяй з-за помніка. Пачаць трэба з таго, што Абдулай гучна адсвяткаваў 50-ю гадавіну Дэкларацыі незалежнасці краіны. З такой нагоды ў сенегальскай сталіцы адбыўся нефармальны саміт афрыканскіх прэзідэнтаў. Наведаў Сенегал і Джэсі Джэксан, вядомы чарнаскуры актывіст Дэмакратычнай партыі ЗША. Кульмінацыяй свята стала адкрыццё 49-метровага мемарыялу Адраджэнне Афрыкі. Мемарыял, зроблены ў стылі савецкай манументалістыкі, уяўляе сабою кампазіцыйную групу з трох фігур — бацькі, маці і дзіцяці, якія і сімвалізуюць адраджэнне Афрыкі. Паводле афіцыйнай інфармацыі, эскіз помніка зрабіў сам прэзідэнт. Ідэя ўшанаваць незалежнасць у камні, аднак, выклікала пратэсты ў апазіцыі. Яна палічыла, што будаваць помнік коштам у 28 мільёнаў долараў ЗША, калі кожны пяты сенегалец жыве за мяжой беднасці, неэтычна. Саюзнікамі сацыялістаў у барацьбе супраць помніка, як не дзіўна, выступілі ісламскія фундаменталісты. На думку мусульманскіх аўтарытэтаў, скульптура супярэчыць канонам ісламу. Мясцовы імам нават рыхтуе спецыяльную фатву супраць прэзідэнта. А народу не падабаецца, што манумент будавалі 50 спецыялістаў з Паўночнай Карэі (як вядома, у гэтай краіне вельмі развіта манументальнае мастацтва), у той час як біржы працы штурмуюць беспрацоўныя сенегальскія будаўнікі.

### НІКАЛЯ САРКАЗІ



Прэзідэнт Францыі выразіў жорстка пакараць тых, хто запусціў у прэсу чуткі пра тое, што паміж прэзідэнтам і ягонай жонкай Карлай Бруні прабегла чорная котка. Аўтары інсінуацыі нават сцвярджалі, што адносіны паміж імі настолькі дрэнныя, што не выключаны разрыў шлюбу. Па словах Сарказі, у яго ўсё ў тым плане нармальна. Маўляў, чуткі пра сварку распаўсюдзілі ягоныя палітычныя праціўнікі. Хто канкрэтна — гэта і павінна высветліць паліцыя. Прэс-сакратар Елісейскага палацу П'ер Шарон кажа, што па ягонай просьбе паліцыя нават завяла справу наконт дыскрэдытацыі лідэра. Па выніках следства адбудзецца суд. Між тым, французская газета «Journal du Dimanche» піша пра тое, што два супрацоўнікі газеты былі звольнены з-за таго, што выкарысталі электронную скрыню выдання, каб дасылаць кампраметуючыя Сарказі матэрыялы. Ці ідзе размова менавіта пра тыя спекуляцыі наконт праблемаў у сям'і Сарказі, пакуль не вядома. З іншага боку, Сарказі павінен зараз думаць пра іншае. Яго рэйтынг упаў да самай нізкай адзнакі з часу абрання на пасаду прэзідэнта.

▸ ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# СПАДАРЫНЯ ЭКА

Марыя Мартысевіч

**Чым заслужылі вечнасць Хацук Курага ды Семіон Хмарны? Чым увайшлі ў гісторыю Беларусі Якім Прытыка, Ян Зайчык ці Яўфімія Вербічанка? Ды нічым. Але кожная з асобаў, якая тоіцца за гэтымі імёнамі, магла б стаць ключавой фігурай новага нацыянальнага міфу — зусім як нічым не прыкметны Баўдаліна, загалоўны герой знакамітага раману Умберта Эка, стаў непасрэдным удзельнікам эпахальных падзей сярэднявечча.**

5 красавіка ў кнігарні галерэі «Ў» пры неверагодным поспеху прайшла прэзентацыя кнігі «…І цуды, і страхі», у якую ўвайшлі гістарычныя эсэ-рэканструкцыі Вольгі Бабковай, супрацоўніцы Нацыянальнага гістарычнага архіву, пясняркі Дамінітры і Херубіна.

Вечарына, якая сімвалічна прыпала на другі дзень Вялікадня, мела ў сабе неверагодную канцэнтрацыю святочнага настрою. Найперш таму, што для многіх прысутных падзея была больш чым чаканай. Сваю першую кнігу гістарычнай эсэістыкі Бабкова, аўтарка, якая даўно прыглянулася чытачу па публікацыях у «Нашай ніве», збірала і складала больш за 15 гадоў. Уладзімір Арлоў, вядоўца прэзентацыі, зазначыў, што кніг у такім жанры ў нас не паўставала даўно, і назваў «…І цуды, і страхі» «сапраўднай падзеяй у нашай гістарычнай эсэістыцы». Бо зазвычай героямі гістарыяграфіі робяцца дзяржаўныя мужы ці харобрыя воіны.

Героі Вользінай кнігі, «калі і мелі славу, то сумнеўную». Інфармацыю пра побыт людзей XVI–XVII стагоддзя пра грошы і кошты, пра дарогі і корчмы, пра імёны людзей і назвы іх дамоў, фальваркаў ды маёнткаў, пра стасункі паміж мужам і жонкай, пра формы іх звароту адно да аднаго, пра менскіх аптэкараў, залатароў, купцоў і суддзяў, рамеснікаў-габрэяў і шляхцюкоў-татараў — аўтарка здабывала з судовых актаў таго часу: апісанняў забойстваў ды рабункаў, ліхвярскіх распісак ды рэестраў маёмасці, дзелавога ліставання ды тэстаментаў.

Па сваіх эмоцыях вечарына крыху нагадвала сустрэчу выпускнікоў гістфаку — нават спявачка Кася Камоцкая згадала, што была гадаванкай менавіта гэтага факультэта. Безліч цёплых словаў аўтарка пачула менавіта ад сваіх супрацоўнікаў па Нацархіве Беларусі. Загадчык НА РБ Уладзімір Дзянісаў, цярэбячы ў руках «шляхаводнік па Менску той эпохі» хваліў за абраны ракурс кнігі, якая атрымалася: «Гэта кніга вартая яшчэ і таму, што мы бачым чалавека». Разам з тым, зазначыў начальнік Вольгі, у ненавуковай, здавалася б, па форме эсэістычнай плыні знайшлося месца гістарычным адкрыццям. Так, аўтарка вызначыла, калі менавіта ў родным горадзе збудавалі «ку оздобе мяста» першую мураваную ратушу — 1600 год. Але, пагадзіліся выступоўцы, «Вольга перадусім — паэт»: кнігі не адбылося б, калі б не тое далікатнае стаўленне да матэрыялу, якое ўласціва аўтарцы. З урыўкавых звестак, якія даюць нам гістарычныя дакументы, пісьменніца склала густоўную, чароўную мазаіку, якая дае ўяўленне пра мінуўшчыну Мінска з амаль фатаграфічнай дакладнасцю.

Падчас чытання складаецца ўражанне: цябе адкідвае на трычатыры стагоддзі назад і акунае ў вір жыцця «залатога веку» Вялікага княства. Эфект, добра вядомы аматарам гістарычных прыгодніцкіх раманаў Умберта Эка, бацькі постмадэрнізму. З той толькі розніцай, што Бабкова балансуе на мяжы — яна не робіць кроку ў мастацкую літаратуру, не дазваляе сабе залішніх інтэрпрэтацый. І таму яе кніга, па добрай традыцыі беларускай гістарычнай прозы, уражвае ўтрая мацней: усё ў ёй — чысцюткая праўда.

«У мяне ёсць звычка запісваць старыя і вабныя словы пісьменнікаў, якія я вельмі люблю, — прызналася Вольга. — Назва кнігі паўстала менавіта такім чынам. Гэта цытата вырваная з кнігі Яна Баршчэўскага. Прачытаўшы, я зразумела: «і цуды, і страхі», — гэта ж пра мяне!» «Нельга пазбаўляць гісторыю той долі захапляльнасці, якая ў ёй прысутная», — цытуе яна гісторыка Марка Блока, і дадае: «Працуючы ў архіве, ты разумееш: ты не на пустым месцы. Гэта дазваляе не пачувацца самотным. У мяне за плячыма стаяць людзі. І я, жывучы, разумею, што таксама буду стаяць за чыімісьці плячыма — проста фактам таго што я існавала, была». Вольга апавяла пра любімых герояў уласнай кнігі. Гісторыя адной з гераінь — а менавіта, князёўны Зафеі Алелькі (Соф'і Слуцкай), мошчы якой захоўваюцца ў праваслаўным кафедральным Святадухавым саборы, уразіць чытача яшчэ адным Вользіным адкрыццём — можна сказаць, палітычным. У 1600 годзе Зафея катэгарычна адмовілася ад шлюбу з князем Янушам Радзівілам, пра што напісала тлумачальны ліст. Праблема была не толькі ў тым, што Януш даводзіўся ёй крэўным сваяком, але і ў тым, што ён належаў да іншага абраду, чым яна (а Зафея ад нараджэння была… каталічкай). Феміністычнага адкрыцця, праўда, не адбылося. Праз паўгады дзяўчыну змусілі да шлюбу.

Паколькі першая кніга ўжо была ў Вольгі ў руках, Уладзімір Арлоў зрабіў аўтарцы раскошны падарунак: напісаную ўласнаручна рэкамендацыю ў Саюз пісьменнікаў. Праўда, як сапраўдны джэнтльмен, прадставіў Вользе права выбару — у які з наяўных у Беларусі пісьменніцкіх саюзаў уступаць, пакінуўшы пропуск у адпаведнай графе. І тут самы час выкрыць яшчэ адно адкрыццё Вольгі, гэтым разам паэтычнае. Напрыканцы судовага акту Слонімскага земскага суда яна адшукала вершаваныя радкі, якія пакінуў там пісар Іван Суета — ці то ад нуды падчас паседжання, ці то з хуліганства і «з разліку на невядомага чытача ў невядомай будучыні»:

*Цнотливый чоловек каждый*
*стреже сумненья своего завждый.*
*Бо цнота каждого цнотловного*
*быва завышона над злото,*
*а нецнота быва подептана из славов его в блото.*

(1591 г.)

У кнізе «…І цуды, і страхі» гэты верш завяршае тэматычны раздзел «Дабрадзействы». Бо чым, як не цнотай і дабрадзействам, ёсць сапраўдная літаратура?



Падчас прэзэнтацыі: Вольга Бабкова, Уладзімір Арлоў, Уладзімір Дзянісаў

▸ КНІГАРНЯ

# УТУЛЬНА І ЗМЯСТОЎНА

**Дзяцей, а пагатоў — падлеткаў, у кнігарнях я не бачыла вельмі даўно. За апошнія год 10, бадай, ніколі. А тут — адразу трое, дыскутуюць над палічкай з дапаможнікамі па новых тэхналогіях. Паварочваюцца — і тут іх позірк трапляе на кнігу «М+Ж» Андрэя Жвалеўскага і Яўгеніі Пастэрнак. Гутарка пераключаецца на абмеркаванне нядаўняга фільму па гэтай кнізе. Маладыя маці з вазочкамі, пенсіянеры з пакетамі малака, офісныя служачыя — здавалася, увесь квартал прайшоў тут цягам гадзіны, зваблены ўсярэдзіну вітрынай, дзе на розных мовах было напісана адно слова — «Кнігі». 5 красавіка «Кніжны салон» на вуліцы Калініна, 5 адчыніў свае дзверы для наведнікаў.**

Ева Вайтоўская

Раней па гэтым адрасе была занядбаная крама абутку. Цяпер памяшканне не пазнаць, бо сюды адначасова прыйшлі Кніга і прыватны бізнес. Ала Зміева, дыпламаваны філолаг, уладальніца фірмы «Брэсол», якая да таго займалася аптовымі пастаўкамі кніжнай прадукцыі ў Беларусь, вырашыла заснаваць уласную кнігарню. Дырэктаркай новага прадпрыемства стала Соф'я Жыбулеўская, — былая кіраўніца «Акадэмкнігі», дасведчаны менеджэр кніжнага рынку, якая вывела буйную кнігарню пры Акадэміі навук Беларусі ў шэраг найлепшых у краіне. Жанчыны паразумеліся што да поглядаў на тое, чым ёсць гандаль кнігамі, і пачалі супрацу. Цяпер у спадарыні Соф'і і ўсяго калектыву няпросты, але захапляльны перыяд — пачатак новай, гэтым разам сваёй справы. «Галоўнае — не атрыманне грошаў, а праца з Кнігай», — выслаўляе дырэктарка «Кніжнага салону» крэда прадпрыемства.

Я пакідаю торбу ў ячэйцы схову, замыкаю на ключ — і цяпер мае рукі свабодныя: можна вольна хадзіць між паліц, гартаючы кнігі… У новай краме пахне свежым рамонтам, але аўра навізны спалучаецца з падкрэсленаа класічным інтэр'ерам, прадуманым і густоўным. Тут (трэба думаць, часова) бракуе хіба утульных канапаў і фатэляў, каб «Кніжны салон» канчаткова набыў салонны выгляд. Класіка і надалей будзе адцяняцца новымі тэхналогіямі, дзеліцца планамі кнігарні спадарыня Соф'я. Тут плануюць паставіць кампутар з каталогам кніг для наведнікаў, у інтэрнэце будзе працаваць сайт для сувязі з чытачамі, неўзабаве з'явіцца тэхнічная магчымасць ладзіць сустрэчы з пісьменнікамі і іншыя камерныя акцыі. Адна з генеральных задачаў на бліжэйшы час — «апраўдаць назву «Кніжны салон»: каб было ўтульна, змястоўна і можна было спакойна размаўляць пра Кнігу ўсім, хто ў ёй зацікаўлены».

Кнігарня толькі пачала працу, і асартымент пакуль што даволі малы, але ўжо бачныя асноўныя кірункі, у якіх будзе развівацца напаўненне. Імкненне прадставіць сучасную беларускую літаратуру ва ўсёй яе красе і сіле спалучаецца з практычным падыходам. Уражвае стэлаж «Руская мова для замежнікаў», не бачаны мной дагэтуль ні ў адной кнігарні сталіцы. Гэтак прадпрыймальніца Ала Зміева зрэагавала на павелічэнне ў Беларусі колькасці студэнтаў з іншых краінаў: «Самастойнасць развівае больш творчы і аператыўны падыход», — кажа спадарыня Соф'я.




І ў той жа час, падкрэслівае яна, «беларуская кніга будзе ў нас на першым месцы — інакш нельга: паважаем нашу літаратуру, нашых аўтараў, нашу гісторыю. Вы бачыце, вялікі аддзел, пры ўваходзе, каб пакупнік адразу звярнуў увагу, адчуваў наша стаўленне да роднага пісьменства. Беларуская кніга будзе прадстаўлена шырока: мастацкая, дзіцячая, навуковая — уся наша кніга». Гаспадыні маюць надзею на плённае супрацоўніцтва як з дзяржаўнымі ды прыватнымі выдавецтвамі, так і наўпрост з пісьменнікамі: існуе магчымасць заключаць дамовы з аўтарамі кніг як з фізічнымі асобамі.

«Трэба ведаць Кнігу. Трэба яе любіць. Гэта незвычайная, вельмі складаная прафесія — увесь дзень на нагах… Прадавец не павінен стаяць на месцы, ён павінен размаўляць з пакупніком. Ставіцца да сваёй справы з душой важна ў любой працы, а асабліва — у працы з Кнігай», — дзеліцца спадарыня Соф'я шматгадовым досведам. На самым пачатку новай справы яна, зразумела, хвалюецца: калектыў усведамляе, што да іх працы будзе прыцягнутая пільная ўвага інтэлігенцыі, што ад іх чакаюць лідэрства і неардынарных падыходаў, што на іх ускладаюць надзеі па абуджэнні айчыннага кнігагандлю ад шматгадовай спячкі. Усе гэтыя надзеі вельмі хочацца апраўдаць. Галоўнае — каб былі сілы і спадарожны вецер.

Калектыў «Новага часу» ад усёй душы жадае новай кнігарні «Кніжны салон» плёну ў іх цікавай, патрэбнай, але вельмі складанай справе.

НЕВЯДОМЫЯ ІМЁНЫ

# АМЕРЫКАНСКІ МАСТАК З ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА КРАЮ

Сяргей Гваздзёў

**Год таму ў Санкт-Пецярбургу, а потым і ў Маскве, філіяле Траццякоўскай галерэі на Крымскім валу, прайшла ўзорна падрыхтаваная выстава «Амерыканскія мастакі з Расійскай імперыі».**

Экспазіцыя, зладжаная намаганнямі 30 міжнародных інстытуцыяў, падтрыманая фінансамі некалькіх буйных карпарацыяў, была прэзентавана 80-цю творамі 40 мастакоў з абшараў былой імперыі і ўвачавідкі паказала, чыімі намаганнямі Нью-Йорк у другой палове ХХ стагоддзя сцвердзіўся ў якасці сусветнай сталіцы абстрактнага экспрэсіянізму.

Вось некалькі імёнаў мастакоў, якія зрабілі ёй гонар. «Творца жывапісу каляровага поля» Марк Ротка (Маркус Якавіч Ратковіч) з Дзвінску, славуты Давід Бурлюк, Іван Дамброўскі — украінец, вядомы пад псеўданімам Джон Грэхам, Леон Гаспар — вучань Пэна, француз з Віцебска, Арчыл Горкі (Востанік Манук Адаян) фантазёр і містыфікатар, які апынуўся ў Амерыцы, ратуючыся ад турэцкага генацыду, і стаў «мастком між еўрапейскім і амерыканскім мадэрнізмам», Макс Вебер, ураджэнец Беластока, «спявак габрэйскай тэмы» і шмат іншых інтрыгуючых імёнаў.

Не маючы намеру рабіць поўны агляд «рускай Амерыкі», прыпынімся на «прэм'еры» мастака з Паўночна-Заходняга краю — Мікалая Цыкоўскага.

Імя яго вы не знойдзеце ў папулярнай ці мастацтвазнаўчай даведачнай літаратуры Расіі ды Беларусі. Першакрыніцы ў зоне недасягальнасці, а друкаваныя біяграфічныя звесткі ў замежных выданнях сцісла-фармальныя і не заўжды дакладныя. Засведчыць асобу, прасвятліць яе першыя крокі, усталяваць кантакты з яго сваякамі, каб хоць пункцірна азначыць постаць мастака дапамагла пастаянная чытачка газеты «Новы Час» Аляўціна Сямёнаўна Вячорка, за што мы ёй бязмежна ўдзячныя.

## Пачатак

Калі пад гонтавым дахам драўлянага дамка на Сіверскай, цяпер Ленінградскай вуліцы ў Пінску, у 1894-м ці 1896 годзе, у шматдзетнай сям'і месцічаў: хатняй гаспадыні Вольгі Іванаўны Макарэвіч (1863–1942) і сталяра-чыгунаадрэўшчыка Сцяпана Аляксеевіча Цыцкоўскага нарадзілася чацвёртае дзіця, ахрышчанае Мікалаем, ніхто і думаць не мог, што на небасхіле амерыканскага мастацтва заззяла яшчэ адна зорачка.



Мікалай Цыкоўскі. Пензенская вучэльня, снежань 1916 г.

Ад пачатку была дарога, што прывяла юнака ў адну з мастацкіх школаў Вільні. «У 1913 годзе разам з Суціным, Крэменем і іншымі, на знак пратэсту супраць кансерватыўных метадаў навучання, Мікалай сышоў з вучэльні і паступіў у Пензенскую мастацкую вучэльню...» — цвердзіць амерыканскае даведачнае выданне. Мяркуем, што наўрад ці праваслаўны юнак вучыўся ў літоўскай альбо габрэйскай мастацкай школе. Пэўна, гэта была бясплатная Віленская рысавальная школа, якой у апошні год яе існавання (1915) было афіцыйна нададзена імя заснавальнікаў — Івана Карнілава і Івана Трутнева. У год эвакуацыі школы Мікалай Цыцкоўскі, як і шмат хто з яе навучэнцаў і проста віленчукоў, відаць, і трапіў у гарадок на волжскім узвышшы — Пензу.

З Вольных мастацкіх майстэрняў, у якія ў 1918 годзе была рэарганізаваная Пензенская вучэльня, з атмасферы мастацкіх студыяў, палітычных мітынгаў і грамадскіх дыспутаў Мікалай быў вырваны мабілізацыяй у Рабоча-сялянскую Чырвоную Армію (РККА). Відаць, тут, а мо крыху і раней, юнак відазмяніў прозвішча, якое выклікала здзеклівыя кпіны ў салдацкім асяродку, на варыянт больш мілагучны і нават ідэалагічна-ўзнёслы. Цыцкоўскі стаў Цыкоўскім.

У 1921 годзе без роздумаў Мікалай рушыў да западвечнай мэты, у знакамітыя 2-я Вышэйшыя мастацка-тэхнічныя майстэрні (***Высшие художественно-технические мастерские — ВХУТЕМАС***), статус якіх прыраўноўваўся да Акадэміі. Настаўнікамі Мікалая былі знаныя жывапісцы-педагогі: рэаліст, майстар каляровай лепкі формы Ілля Машкоў і заснавальнік музычнага і элегічнага, маляўніча-пластычнага стылю ў жывапісе Павел Кузняцоў.

## За акіянам

У пошуках кавалка хлеба ў 1918 годзе выправіўся на заробкі бацька мастака і знік без звестак. За лепшай доляй паляцеў у Амерыку брат Рыгор. За «рыжскай мяжой» апынуўся Пінск, дзе хоць і не адна, а з дочкамі гібела маці.

Мяркуем, Мікалай Цыкоўскі, як і шмат хто з яго знаёмых і сяброў «успрыняў рэвалюцыю з захапленнем, але не цалкам», ці, як тлумачылі за савецкім часам ідэолагі, «не змог прыжыцца ў паслярэвалюцыйнай



рэчаіснасці». Склаўшы ў 1923 годзе сваё мастацкае начынне і астатні немудрагелісты скарб (у прыватнасці фотаальбом, які зараз захоўваецца ў амерыканскіх нашчадкаў), з'ехаў у ЗША. Тамтэйшыя інфармацыйна-даведачныя выданні сцісла паведамляюць: «У Амерыцы Цыкоўскі пачынаў пісаць карціны ў стылі кубізму».

Мо яно і так. Аўтару ж, апрача адзінкавых рэчаў мастака ў стылі моднага тады кубізму, па большасці трапляліся на вочы рэпрадукцыі твораў з прыкметамі стылістыкі неапрымітывізму. У кампазіцыях Цыкоўскага, як і ў асобных творах Давіда Бурлюка, братоў Рафаэля і Мозеса Сойераў з Тамбоўшчыны, шматлікія героі займаюць вельмі нязначную частку палатна. У творах чуецца адасобленасць і адзінота душаў герояў у шырокім і адкрытым свеце.

Натуральна, што падчас змушанага адкрыцця Амерыкі выгнаннікі трымаліся адзін аднаго, пароўну падзяляючы радасці і нягоды новага жыцця. Пэўна ўжо ў Злучаных Штатах Цыкоўскі коратка сышоўся з дзіцём вольніцы стэпу, украінскім патрыётам і радыкалам, апекуном Маякоўскага, сябрам Хлебнікава і Кручоных, па сумяшчальнасці яшчэ і «бацькам рускага футурызму» — Давідам Бурлюком, які ступіў на Амерыканскі кантынент годам раней, хоць эміграваў у Японію яшчэ ў 1920 годзе.

Мікалай быў блізкім сябрам неўтаймоўнага Давіда, хросным бацькам яговых дзяцей і напісаў у 1924 годзе партрэт яго жонкі — «Маруся Бурлюк». Дарэчы, гэты «інтэрнацыянал» выгнаннікаў з імперыі — Бурлюк, Цыкоўскі, Грос, Сойеры, і інш. — увекапомнены ў сюжэтнай кампазіцыі Рафаэля Сойера «Мае сябры. My Friends» (1948). На палатне надпіс-дэвіз: «Сяброўства — віно жыцця».

Амерыка, якую наўрад ці чымсьці можна здзівіць, захапляла і дзівіла сама. Эмацыйныя ўражанні ад сустрэчы з Новым Светам адбіліся ў нізцы краявідаў Мікалая Цыкоўскага, прысвечаных Нью-Йорку. У 1931–1932 гадах ён выстаўляецца ў Нью-Йорку ў галерэі Дэніэлса, затым у галерэях Чыкага, Філадэльфіі, Лос-Анжэлесе.

Невядома, ці імкнуўся мастак Цыкоўскі, у якога ў 1933 годзе нарадзіўся сын, на радзіму так горача і шчыра, як гэта рабіў сябра, па вызначэнні крытыкі, «амерыканскі Ван Гог» Давід Бурлюк. Напярэдадні другой сусветнай вайны той нават падаваў заяву ў генеральнае консульства СССР у Нью-Йорку з просьбай дазволіць вярнуцца, але, на шчасце, атрымаў адмову.

Дзякуючы лісту пляменніцы да аўтара нататкі, Вольгі Уладзіміраўны Рудакоўскай-Волчак, з'явіліся дадатковыя штрыхі да эскізнага малюнка мастака з Беларусі ды сцісла інфармацыя пра ягоных амерыканскіх спадчыннікаў.



## Лісты ў Беларусь

Сталы жыхар Нью-Йорка, знаны ў прафесійных колах мастак і выкладчык Мікалай Цыкоўскі толькі пасля вайны даведаўся, што пад акупацыяй, у 1942 годзе, памерла маці. У часы апантанай сталінскай пабудовы сацыялізму і «абвастрэння класавай барацьбы» не магло быць і гаворкі пра ліставанне з «імперыялістамі».

Па вайне лучылі яго з прывідным краем былой імперыі сёстры і іхнія дочкі... Тады ж з ЗША ў разораную Беларусь паляцелі лісты ды падарункі. Але не ў радасць стаўся шчыры клопат «амерыканскага дзядзькі». Увайшоўшыя ў красу паненкі паспелі пабрацца шлюбамі з афіцэрамі — пераможцамі, якім кампетэнтныя органы коратка, але даходліва растлумачылі, што апрача «савецкага гонару і годнасці» ёсць у Крымінальным кодэксе артыкул 58 з падпунктам аб шпіянажы. Тады ж з разоранай вайной Беларусі ў ЗША паляцелі непрачытаныя лісты і нераспакаваныя падарункі.

Мо трэба было б распавесці пра нязздзейсненае. Пра выставу Давіда Бурлюка 1962 года, па ягоным выразе, «у піку маскалям», у складзе якой былі работы Цыкоўскага, пра выставу, якая накіроўвалася ў СССР, але даехала толькі да Прагі. Абарвалася нітачка...

Нітка зямнога жыцця доктара філасофіі Гарвардскага ўніверсітэта (1965), дырэктара Тэхаскага музея мастацтваў у Осціне» (1970), сябра Нацыянальнай Акадэміі мастацтваў, Нацыянальнага інстытута мастацтваў, літаратуры і супольнасці мастакоў, дойлідаў і гравёраў ЗША, удзельніка прэстыжных аўкцыёнаў і выстаў (толькі ў Амерыцы прайшло больш за 20 персанальных), Мікалая Цыкоўскага абарвалася ў Вашынгтоне ў 1987 годзе.

***P.S.:***

*У Вашынгтоне жыве сын Цыкоўскага, таксама Мікалай. Пасля заканчэння Гарвардскага ўніверсітэта ён атрымаў ступень доктара філасофіі і гісторыі мастацтваў, выкладаў гісторыю мастацтваў у каледжах і ўніверсітэтах ЗША, быў галоўным куратарам амерыканскага жывапісу ў Нацыянальнай галерэі.*

*У Пінску — магіла Вольгі Іванаўны, маці мастака. Захаваўся дом, у якім нарадзіўся Мікалай Цыкоўскі. У доме тым да 1950-х гадоў стаяла мэбля, зробленая яго бацькам і вісела некалькі абразкоў, напісаных Мікалаем. (Калі і куды яны зніклі, ніхто не памятае).*

*А яшчэ, колькі месяцаў таму пляменніца мастака — Валянціна Іванаўна Цыцкоўская — неабачліва ці з эканоміі пенсійных сродкаў паслала адзіную даваенную фотавыяву таго драўлянага, крытага гонтам дамка на былой Сіверскай у Мінск звычайным лістом. Па дарозе ліст, натуральна, згубіўся.*

ВЫСТАВА

# НАРМАНДЫЯ Ў ЖЫВАПІСЕ

Сяргей Гваздзёў

**Выстава «Нармандыя ў жывапісе», адкрытая для наведвальнікаў Нацыянальнага мастацкага музея да 25 красавіка, зачароўвае і палоніць.**

Пасля экспанавання ў Аўстрыі, ЗША, Італіі, краінах Паўночнай Еўропы і ў Эстоніі ды Латвіі, калекцыя гэта сталася першай сапраўднай ластаўкай леташніх дамоўленасцяў высокага ўзроўню аб франка-беларускім культурным супрацоўніцтве.

Назва выставы «Нармандыя ў жывапісе» ўдала адпавядае яе канцэпцыі. Гэты еўрапейскі куток Францыі, паказаны сродкамі новага жывапісу мастакоў XIX — пачатку XX стагоддзяў хораша і поўна. Выстава настолькі прыгожая і насычаная, што ўзнікае спакуса назваць яе «энцыклапедыяй» французскага мастацтва XIX стагоддзя.

Нармандскі краявід з яго раўнінамі, берагам і морам, небам і малавядомымі таемнымі бакамі існавання, падпарадкаваны непасрэднаму ўплыву сонца і паветра, «зямлі і неба» неабсяжна разнастайны па сваім кругаглядзе — ад «шэрага імпрэсіянізму» да «перламутравага каларызму» — увекапомнены ў жывапісе. Укладзеная з 80-ці твораў, зусім непамернага, не эпічнага, а хутчэй камерна-лірычнага жывапісу, выстава знаёміць беларускага гледача больш чым з трыццаццю зоркамі мастацтва XIX–XX стагоддзяў.

На выставе прадстаўлены творы такіх мэтраў, як Тэдор Жэрыко (1791–1824), энергічны і дынамічны мастак высокага напалу жарсцяў, які лічыцца адным з заснавальнікаў рамантычнай плыні ў французскім мастацтве. Жан-Батыст Каміль Каро (1796–1875), мастак, за чыімі работамі палявалі Напалеон III і герцаг Арлеанскі. Шарль Дабіньі (1817–1878) — сын вядомага французскага пейзажыста, які вылузнуўся з акадэмічнай школы і дзякуючы свайму свабоднаму, чуйнаму і светаноснаму мазку далучыўся да імпрэсіяністычнай плыні. Эжэн Будэн (1824–1898), мастак-вандроўнік, прадвеснік імпрэсіянізму і адзін з заснавальнікаў пленернай «Сен-Сіменаўскай школы», чыя палітра вібруючых тонаў перадавала трапяткія адценні святла і яго адбіткі на люстраной гладзі вады. Клод Мане (1840–1926), знакавая асоба не толькі імпрэсіянізму, але і ўсяго мастацтва XIX–XX стагоддзяў, які разглядаецца французскімі гісторыкамі мастацтва як папярэднік лірычнага абстракцыянізму. Рауль Дзюфі (1877–1953), што пачынаў свой творчы шлях пад уплывам Будэна і Мане, але здолеў распрацаваць свой стыль і данесці да гледача каштоўнасці сваёй душы. Альбер Марке (1875–1947), графічна-лаканічны прадстаўнік мастацтва мадэрну ў яго фавістычнай разнавіднасці, які зазнаў уплыў імпрэсіянізму і з радасцю перадаваў натуру ў розныя поры года, пры розным асвятленні ці без яго ўвогуле. Жак Війон (1879–1963) — мастак спадчыннай мастацкай культуры, які імкнуўся інтэрпрэтаваць кубізм як своеасаблівы працяг імпрэсіянізму.

Апрача гэтых імёнаў беларускі глядач парадуецца і ўзбагаціць знаёмствам з такімі выдатнымі і рознымі мастакамі, як Іаганам Йонкіндам, Фрэнкам-Маерсам Богтсам, Гіёмам Фаусам, Роберт-Антуанам Піншонам і іншымі вартымі ўвагі і ўздзячнасці.

Як азначыў генеральны куратар, дырэктар калекцыі «Нармандыя ў жывапісе» Ален Тапье, літаратурна ўтвораная і «няскораная рамантычная жарсць» пачынае паддавацца імпрэсіяністычнаму парыву. Мастацтва змяняецца сюжэтна і прадметна, спакваля сціраецца традыцыйны, сканструяваны сэнс «перад тварам свабоднага натхнення асобы», а інтэрпрэтацыя рэальнага чалавека і Бога дадзенай прыроды паступова займае галоўнае месца. Зайздросную мажлівасць убачыць і адчуць гэта мае беларускі глядач.

Выстава карысная беларусам і з пазамастацкага, грамадзянскага гледзішча. Свята, наладжанае з ласкі Амбасады Францыі ў Беларусі, даводзіць, як мастацкі збор, запачаткаваны ў 1992 годзе, які паўстаў з супольнай ініцыятывы дзяржаўных органаў, органаў мясцовага самакіравання, калекцыянераў і аматараў мастацтва, набыў сусветную вядомасць і ўнёс дадатковы выразны штрых у партрэт Нармандыі.

АГЛЯД

## НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

Побач з экспазіцыяй французскіх майстроў Нацыянальны мастацкі музей дэманструе не зусім тыповую выставу «Накіды і малюнкі рускіх мастакоў XIX–XX стагоддзяў» (працуе да 24 красавіка).

Валодаючы вялікай калекцыяй малюнкаў, музей мае магчымасць увесці наведвальнікаў у таямнічы свет падыходу да стварэння скончанага твора, свет пошуку кампазіцыйнага рашэння, папярэдняй працы з натурным аб'ектам, нараджэння агульнай ідэі твора. У накідах фіксуецца першае ўражанне ад з'явы, самае непасрэднае бачанне руху, настрою, формы, адлюстроўваецца здольнасць творцы зафіксаваць тыя непаўторныя моманты рэчаіснасці, якія неабходна захаваць ці перадаць у працэсе працы.





Непасрэднасць накідаў можа рабіцца асновай для эстэтыкі цэлых мастацкіх накірункаў, як гэта выяўлялася ў школах старадаўняга кітайскага і японскага малюнка, альбо, як у еўрапейскім мастацтве, служыць важнай складовай часткай творчага метаду мастака. Так ці інакш, першасныя накіды ўводзяць у таямніцу творчага метаду аўтара, даюць магчымасць ясней адчуць яго почырк, тэмперамент, энергетыку яго метаду, характар яго погляду на свет. Лёгкія для ўспрыняцця, малюнкі паказваюць няпросты шлях пошуку, які творца праходзіць перад стварэннем «вялікай» працы: большасць твораў належыць не мастакам-графікам, а менавіта жывапісцам.

Набор імёнаў, якія ўключаны ў экспазіцыю, не расчаруе наведніка. Гэта накіды Івана Шышкіна, Яфіма Волкава, Барыса Кустодзіева, Філіпа Малявіна, замалёўкі ілюстрацый да твораў рускай класікі Канстанціна Рудакова, анімалістычныя малюнкі Валянціна Сярова да баек І.А. Крылова, накіды звяроў і птушак Аляксея Сцяпанава, Вадзіма Фралова. Асноўная частка графічных аркушаў прадстаўлена ўпершыню.

## ПАЛАЦ МАСТАЦТВАЎ

З 7 па 11 красавіка на Казлова, 3 праводзіць картакатэрміновую выставу-конкурс новых імёнаў «Belarus Art Week / Беларускі тыдзень мастацтваў».

Мерапрыемства ўваходзіць у Асацыяцыю тыдняў мастацтваў, якія адбываюцца ў Маскве, Пецярбурзе, Кіеве, Браціславе, Алма-Аце і Варшаве, што дае магчымасць пераможцам нацыянальных экспазіцый прадставіць плён сваёй творчасці за мяжой. Такім чынам, наведаўшы Палац мастацтваў гэтымі днямі, можна тапіць на пляцоўку творчага адбору новых імёнаў мастакоў, прагных праславіць сябе і краіну.

Паралельна праходзяць выставачная праграма, да якой творы адбіраліся паводле працэдуры вольнай заяўкі, праца міжнароднага журы ў конкурсах па жывапісу, графіцы, скульптуры, ужытковым мастацтве і фатаграфіі, і майстар-класы, да якіх могуць далучыцца ўдзельнікі экспазіцыі і наведвальнікі. Фінальная частка, узнагароджанне пераможцаў — у панядзелак 11 красавіка з 14.00 па 16.00.

## МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ

Апошнія дні ў Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» ў Палацы Рэспублікі працуе не зусім звычайны праект «BY.DE», там можна пазнаёміцца з сучасным накірункам альтэрнатыўнага мастацтва — творчасцю беларускіх графіці-мастакоў.

Малюнкі балончыкамі на паверхнях будынкаў, аб'ектаў і агароджаў, часцей несанкцыянаванага грамадствам характару, што сталі папулярныя з 1960-х гадоў у амерыканскіх мегаполісах, а затым пашырыліся па ўсім свеце, часам успрымаюцца як пратэстная ці асацыяльная з'ява. Маюць адпаведную назву «Art Crimes» і часам, па факце выканання, цягнуць за сабой пакаранне мастака.

Але існуе і «легальны» накірунак, у межах якога можна выявіць найперш мастацкія вартасці метаду і эстэтычна пазмагацца з шэрай рэальнасцю гарадскога ландшафту. Выстава ладзіцца пры ўдзеле нямецкіх партнёраў з Калегіі імя Тэадора Хойса.



***

Нестандартныя экспазіцыі, якія раскрываюць творчыя метады «іншых» жанраў мастацтва, дапаўняе паказ плакатаў і эскізаў да фільмаў Валерыя Рубінчыка «+ пра кіно» ў Музеі гісторыі беларускага кіно на вул. Свярдлова, 4. Апрача плакатаў з 6 па 30 красавіка будуць паказаны эскізы мастакоў па касцюмах і мастакоў-пастаноўшчыкаў, што працавалі з рэжысёрам — Элы Сямёнавай, Яўгена Ігнацьева, Уладзіміра Дзяменцьева, Аляксандра Чартовіча.

**Падрыхтаваў Аляксей Хадыка**

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 314
Падпісана да друку 9.04.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.